Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 20 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 158 (4702)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Японскі жандар у ролі „дакладчыка“ аб Куч

ХАБАРАЎСК, 19 (Белта). Тут атрыманы зусім даставерныя весткі, што 4-га ліпеня на станцыі **Пагранічная** пад старшынствам начальніка японскай ваеннай місіі адбылося пасяджэньне японска-манчжурскага таварыства.

На гэтым пасяджэньні з дакладам аб **КУЧ** выступіў начальнік жандарскага аддзяленьня **Іноуз**. Па дакладу была прынята рэзалюцыя аб тым, што ў выпадку **правалу Такійскіх перагавораў, таварыства павінна зьвярнуцца да манчжурскіх улад з патрабаваньнем захапіць КУЧ узброенай сілай.**

СПАБОРНІЦТВА У ВЁСЦЫ ПЕРАТВОРЫМ У СПРАВУ МІЛЬЁННЫХ МАС

Першы ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў абвясьціў ўсесаюзнае спаборніцтва рэспублік, краёў, абласьцей, раёнаў, саўгасаў, МТС і калгасаў на лепшую якасьць сельска-гаспадарчых работ, на высокі ўраджай. 7-га чэрвеня «Праўда» падвяла вынікі першага туру гэтага спаборніцтва, вынікі спаборніцтва на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы. Усесаюзнае першынства ў гэтым першым туры заваявала **Татарская рэспубліка.** Яна-ж, у асобе ўсетатарскага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, выступіла застрэльшчыцай у другім туры спаборніцтва, абвясьціўшы барацьбу за ўсесаюзнае першынства ў справе ўзорнага правядзеньня ўборкі і збожжапаставак дзяржаве.

У сучасны момант паміж сабой спаборнічаюць у другім туры наступныя рэспублікі, краі і вобласьці:

1. Татарская рэспубліка, Сярэдня-Волскі край, Днепрапятроўская і Адэская вобласьці;

2. Днепрапятроўская вобласьць з усімі іншымі абласьцямі Украіны;

3) Крым і Днепрапятроўская вобласьць;

4) Адэская і Харкаўская вобласьці;

5) Кісўская і Харкаўская вобласьці;

6) Маскоўская вобласьць і Горкаўскі край;

7) ЦЧВ і Сярэдня-Волскі край;

8) Заходня-Сібірскі край і Уральская вобласьць;

9) Беларуская рэспубліка і Заходняя вобласьць;

10) Рэспубліка немцаў Паволжа, Дагестанская рэспубліка і Мардоўская вобласьць.

Фронт спаборніцтва пашыраецца. **Сёньня мы публікуем тэлеграму паўночна-каўкасіх краявых арганізацый, якія выклікаюць на сацыялістычнае спаборніцтва ва ўборцы, абмалоце і збожжаздачы Ніжня-Волскі край і Харкаўскую вобласьць.** Ад Харкаўскай вобласьці адказ ужо атрыман. Тав. **Постышаў** паведамляе Паўночна-Каўкаскаму крайкому і крайвыканкому, што бальшавікі, камсамольцы, рабочыя і калгасьнікі Харкаўскай вобласьці прымаюць выклік і высылаюць дэлегацыю для абмеркаваньня і падпісаньня дагавору аб спаборніцтве. Вялізарны разварот сацыялістычнага спаборніцтва облета ў вёсцы—шчэ адзін пазьвычай яркі і бясспрэчны доказ правільнасьці тэзісу **Леніна:** «Сацыялізм ня толькі не пагашае спаборніцтва, а падазрэ, упяршыню стварае магчымасьць ужываць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, уцягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, выявіць таленты, якіх у народзе—непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, ціснуў, душыў тысячамі і мільёнамі».

Сотні тысяч талентаў праявіліся ў вёсцы ў веснавую сяўбу гэтага году ў такіх маштабах, як ніколі да гэтага часу. Зараз, калі пачалася ўборка ўраджаю і збожжапастаўкі, калі наступіў рашаючы перыяд с-г году, сацыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы набывае шчэ больш грандыёзны размах, практычна становіцца справай гонару, адвагі і геройства мільёнаў калгасьнікаў.

Ня можа быць ніякіх сумненьняў у тым, што рашымасьць паўночна-каўкаскай партыйнай і камсамольскай арганізацый, рабочых і калгасьнікаў Паўночнага Каўказу, раўнымасьць эмацыя за гаптровае месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы выкліча шчэрую радасьці і ўздыму ва ўсёй нашай краіне. Вялізарная барацьба і работа, развернутыя на Паўночным Каўказе пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту партыі завяршыліся вялікарным посьпехам у веснавой сяўбе. Паўночны Каўказ прыступіў ужо да масавай уборкі багатага ўраджаю гэтага году. **За ходам уборкі на Паўночным Каўказе, за ходам збожжапаставак яго ва будзе сачыць уся краіна, і справа гонару бальшавікоў Паўночнага Каўказу—узорна з гэтымі задачамі справіцца.**

«Праўда» ў сувязі з атрыманымі ад раду спаборнічаючых рэспублік, краёў і абласьцей, і ў прывітаньні ад Паўночнага Каўказу прапановамі **устанаўляе ўсесаюзную чырвоную дошку, на якую будуць заносіцца калгасы, МТС, саўгасы, раёны, вобласьці, краі і рэспублікі,** сабраўшыя з кожнага гэктара ўраджай поўнасьцю, выканаўшыя **датэрмінова** план збожжапаставак дзяржаве і, побач з гэтым датэрмінова даўшыя натураплату МТС і вярнуўшыя дзяржаве насенную, харчовую і фуражную пазыкі.

Для пасьпяховага разгортваньня ўсесаюзнага спаборніцтва неабходна, каб увесь бальшавіцкі друк, пачынаючы з рэспубліканскіх, краявых і абласных газэт і канчаючы шматтыражкамі палітаддзелаў саўгасаў і МТС, арганізаваў самы пільны кантроль і апэратыўнае кіраўніцтва спаборніцтвам. Мы лічылі-б карысным, каб газэты спаборнічаючых рэспублік, краёў і абласьцей арганізавалі сыстэматычна (два разы ў месяц) абмен старонкамі аб вопыце аховы ўраджаю, уборкі, абмалоту, збожжапаставак з тым, каб партыйная, камсамольская арганізацыі, рабочыя і калгасьнікі давай вобласьці ведалі, як ідуць справы другой вобласьці, якая з імі спаборнічае. Добра было-б гэты абмен вопытам пачаць у першых-жа лічбах жніўня падвядзень нем спаборніцкіх вынікаў.

Абмен вопытам—абавязковая частка сацыялістычнага спаборніцтва. Нельга забываць, што сацспаборніцтва ў адрозьненьне ад буржуазнай канкурэнцыі, мае мэтай дабіцца агульнага ўздыму. «Прынцып сацспаборніцтва,—пісаў тав. **Сталін,**—таварыская **дапамога** адстаўным з боку перадавых, з тым, каб дабіцца **агульнага ўздыму.** Канкурэнцыя гаворыць **«Даганяй** адстаўных, каб зацьвердзіць сваё панаваньне. Сацспаборніцтва гаворыць: «адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш—**даганяй лепшых** і дабіся **агульнага ўздыму.** Гэтым, уласна, і тлумачыцца той пачуваны вытворчы энтузіязм, які ахапіў мільённыя масы працоўных у результаце сацспаборніцтва. Няма чаго і гаварыць, што канкурэнцыя ніколі ня можа выклікаць чаго-небудзь падобнага да такога энтузіязму мас».

Мы лічылі-б таксама карысным, каб побач з усесаюзнай чырвонай дошкай рэспубліканскія, краявыя, абласныя, раённыя і палітаддзелаўскія газэты ўстанавілі мясцовыя чырвоныя дошкі па ўзоры ўсесаюзнай.

Асаблівую ўвагу ў ходзе спаборніцтва мы абавязаны зьвярнуць на самае шырокае разьвіцьцё розных форм самадзейнасьці калгаснай масы і рабочых саўгасаў. Калі ў перыяд веснавой пасеўнай кампаніі мы мелі дзесяткі тысяч інспекцый якасьці ў калгасах і саўгасах, у склад якіх уваходзілі лепшыя калгаснікі і рабочыя саўгасаў, то цяпер, у перыяд уборкі, трэба дабіцца, каб інспекцый якасьці ў калгасах і саўгасах былі **сотні тысяч!**

Формы самадзейнасьці мас, як і ўвесну, ня будуць, відома, абмежаваны інспекцыямі якасьці. Узаемная праверка адзін другога, брыгад, калгасаў, націск на адстаючых, кантроль за ходам уборкі і збожжапастаўкі дзяржаве з боку дэлегатаў усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў і мясцовых зьездаў, актыўнасьць усіх узрестаў ад піянэраў да глыбокіх дзядоў—усё гэта неабходна прывесьці ў дзеяньне для посьпеху спаборніцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва па ўборцы ў гэтым годзе мы можам разгарнуць у небывалых шчэ разьмерах. Для гэтага ёсьць усе ўмовы: па-першае, у саўгасах і МТС у паяўнасьці дасканалыя арганізатары — работнікі палітаддзелаў; па другое, з посьпехам перабудоўваецца вясковая партыйная арганізацыя, створаны калгасныя ячэйкі, партгрупы (або парторгі) у брыгадах; па-трэцяе, у калгаснага актыву нагакпіўся багаты вопыт спаборніцтва на пасеўнай кампаніі гэтага году.

Задача зараз у тым, каб усе вагары, усе сродкі прывесьці ў рух і надаць другому туру ўсесаюзнага спаборніцтва самы магутны размах. Масавая ўборка ў паўднёвых раёнах Савецкага саюзу пачалася. Мы клічам усіх бальшавікоў, камсамольцаў, піянэраў, усіх чэсных, добрасумленных калгаснікаў і рабочых саўгасаў, як лепшых байцоў, змагацца за тое, каб іх калгас, МТС, саўгас, раён, вобласьць, край, рэспубліка занялі ганаровае месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы. Мы клічам іх да хутчэйшага ажыцьцяўленьня лёзунгу тав. Сталіна—зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Уся краіна з непрыхаванасьцю чакае, чыё слаўнае імя першым упрыгожыць усесаюзную чырвоную дошку!

(З перадавой «Правды»).

АБ ПЛЯНЕ АЗІМАЙ СЯЎБЫ НА 1933 ГОД

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацьвердзіць наступны плян азімай сяўбы на 1933 год у саўгасах, калгасах і аднаасобных гаспадарках па рэспубліках, краёх і абласьцях (у тысячах гэктараў):

Рэспублікі, краі і вобласьці	Усяго па ўсіх сельска-гаспадарчых сэктарох	У тым ліку: Калгасы	З іх калгасы, якія абсл. МТС	Саўгасы ўсіх сыстэм	НК саўгасаў	НКЗему	НКСнабу	Цэнтрасаюзу	Іншыя саўгасы	Адпаасобнікі
Паўночны край	300,0	216,0	18	4,0	1,50	0,29	—	0,7	1,51	80,0
Карэльская АССР	17,0	11,0	1	—	—	—	—	—	—	6,0
Ленінградская вобласьць	535,0	315,0	80,0	10,0	1,00	0,90	4,10	1,7	2,30	210,0
Заходняя вобласьць	1.345,0	825,0	215	25,0	12,65	5,31	2,30	1,5	3,04	495,0
Маскоўская вобласьць	1.670,0	1.240,0	260	60,0	14,20	13,63	23,70	8,4	20,07	350,0
Іванаўская вобласьць	603,0	495,0	135,0	18,0	9,65	3,99	2,00	2,3	0,08	180,0
Горкаўскі край	2.402,0	1.272,0	275,0	20,0	6,00	6,70	0,15	1,4	5,75	1.110,0
ЦЧВ	3.900,0	2.896,0	1.830	277,0	126,40	44,18	74,10	6,2	26,12	727,0
Уральская вобласьць	1.260,0	1.057,0	500	103,0	84,70	10,54	0,30	5,7	1,70	100,0
Башкірская АССР	980,0	745,0	325	65,0	59,40	4,00	—	1,6	—	170,0
Татарская АССР	1.250,0	970,0	485	40,0	21,10	12,55	—	1,9	4,45	240,0
Сярэдня-Волскі край	2.600,0	2.100,0	1.200	320,0	251,10	41,10	2,60	5,2	20,00	180,0
Ніжня-Волскі край	2.430,0	2.091,0	1.342	299,0	269,75	15,79	2,40	4,2	6,86	40,0
Паўн.-Каўкаскі край	3.930,0	3.030,0	2.458	720,0	594,05	74,70	12,50	13,2	25,55	180,0
Крым. АССР	500,0	377,0	319	107,0	78,50	11,07	1,75	3,0	12,68	16,0
Казакск. АССР	550,0	468,0	294	72,0	56,00	10,01	1,90	2,0	2,09	10,0
Кара-Калпакск. АССР	5,0	3,3	3	0,3	—	0,03	—	—	—	1,67
Зах.-Сіб. край	560,0	410,0	218	50,0	44,60	1,25	0,20	2,0	1,95	100,0
Усходн.-Сібірск. край	270,0	185,0	85	19,4	15,70	0,44	—	0,6	2,66	65,6
Якуцкая АССР	1,0	1,0	0,3	—	—	—	—	—	—	—
Далёка-Усходні край	32,0	24,0	20	1,0	—	0,04	0,02	0,7	0,24	7,0
УССР	10.000,0	7.580,0	6,200	950,0	535,80	84,03	197,58	35,6	96,99	1.470,0
БССР	1,260,0	748,0	260,0	36,0	26,60	6,74	—	2,5	0,16	476,0
ЗСФСР	970,0	450,0	250,0	56,0	14,20	31,30	1,80	4,4	4,30	464,0
Узб. ССР	340,0	189,0	115	101,0	62,70	34,15	—	1,2	2,95	50,0
Тадж. ССР	122,0	76,7	21	13,5	10,50	2,50	—	0,1	0,40	31,8
Туркм. ССР	98,0	71,0	52	17,0	0,50	3,30	—	1,5	11,70	10,0
Кіргіз. АССР	80,0	59,0	42	11,0	3,20	4,45	2,20	0,2	0,95	—
УСЯГО ПА СССР	38.010,0	27.815,0	17.073,3	3.414,93	2.300,0	422,99	329,60	107,8	254,54	6,780,07

У тым ліку азімай пшэніцы (у тыс. гэктар)

Рэспублікі, краі і вобласьці	Па ўсіх с.-г. сэктарох	У тым ліку: Калгасы	З іх калгасы, якія абслуг. МТС	Саўгасы ўсіх сыстэм	З іх: Наркам саўгасаў	Наркам Зему	Наркам снабу	Усе іншыя саўгасы	Адпасобнікі
Паўночны край	3,0	3,0	2,5	—	—	—	—	—	—
Карэльская АССР	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Ленінградзкая вобласьць	50,0	42,0	21,0	1,0	0,1	0,22	—	0,68	7,0
Маскоўская вобласьць	100,0	80,0	34,0	15,0	2,3	3,42	5,40	3,88	5,0
Заходняя вобласьць	60,0	46,0	17,0	3,0	0,3	0,37	1,60	0,73	11,0
Іванаўская вобласьць	80,0	68,0	22,0	2,0	0,3	0,52	0,50	0,68	10,0
Горкаўскі край	30,0	26,0	12,0	1,0	0,1	0,21	—	0,69	3,0
ЦЧВ	742,0	610,0	460,0	112,0	46,3	14,39	48,39	2,92	20,0
Уральская вобласьць	2,0	2,0	2,0	—	—	—	—	—	—
Башкірск. АССР	5,0	5,0	4,0	—	—	—	—	—	—
Татарская АССР	17,0	16,0	12,0	1,0	—	1,00	—	—	—
Сяр.-Волскі край	222,0	145,0	105,0	77,0	67,6	6,91	1,17	1,32	—
Ніжня-Волскі край	341,0	260,0	214,0	81,0	72,9	3,24	1,10	3,76	—
Паўн.-Каўкаскі край	3.024,0	2.264,0	1.881,0	610,0	511,6	57,02	12,00	29,38	150,0
Крымск. АССР	488,0	373,0	313,5	99,0	75,5	10,34	1,75	11,41	16,0
Казакск. АССР	303,0	272,0	144,0	28,0	17,2	7,43	1,90	1,47	3,0
Кара-Калпакск. АССР	5,0	3,3	3,0	0,03	—	0,03	—	—	1,67
Зах.-Сіб. край	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Усх.-Сіб. край	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Якуцкая АССР	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Далёка-Ўсходні край	—	—	—	—	—	—	—	—	—
УССР	5.731,0	4.700,0	4.250,0	690,0	415,1	56,9	163,14	54,86	341,0
БССР	60,0	47,0	13,0	3,0	1,8	0,45	—	0,75	10,0
ЗСФСР	772,0	313,0	195,0	42,0	11,0	21,1	1,78	8,12	417,0
Узб. ССР	298,0	168,0	105,0	83,0	60,88	17,97	—	4,15	47,0
Туркм. ССР	80,0	52,0	46,0	10,0	0,2	1,4	—	8,4	8,0
Кіргіз. АССР	78,0	59,0	42,0	9,0	2,6	3,75	2,20	0,45	10,0
СССР	12.600,0	9.630,3	7.914,0	1.879,03	1.296,08	207,87	240,93	134,15	1.090,67

3. Устанавіць, што абавязковая пастаўка збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі павінна рабіцца толькі з тэй плошчы, якая устаноўлена для іх па пляну на аснове даных пастановы.

З плошчы, засеянай калгасам або аднаасобнай гаспадаркай звыш гэтага пляну, абавязковая пастаўка збожжа дзяржаве не праводзіцца.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР І. МІРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль, 17 ліпеня 1933 г.

Гарадоцкая МТС зрывае падрыхтоўку ільнацерабільшчыкаў

ГАРАДОК. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Летась агенты клясавага ворага, якія пралезьлі ў Гарадоцкую МТС, зрабілі ўсё, каб толькі сарваць мэханізаваную ўборку ільну.

—Ільнацерабілка «Камсамолка»—машына нерэнтабэльная,—так разважалі некаторыя работнікі МТС. Ня толькі разважалі, але і практычна на кожным кроку шкодзілі, каб скампрамэтаваць «Камсамолку». Падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў церабільшчыкаў была сарвана. У самы разгар уборкі ільнацерабілкі бясспрытульнымі валяліся па двары МТС і па калгасах. Уборка ільну ішла ўручную са спазьненьнем, са стратамі.

Сумныя вынікі мінулага году, аднак, мала чаму навучылі цяперашніх кіраўнікоў Гарадоцкай МТС. Гісторыя зноў паўтараецца.

Паводле пляну Гарадоцкая МТС павінна была падрыхтаваць 95 церабільшчыкаў. Сабралася-ж на курсы толькі 35 чалавек. Навучаецца зараз 32. А ільнацерабілак у МТС ёсьць 50 штук. Хто-ж па іх будзе працаваць—так і невядома.

Курсы праводзяцца на сьпех, праграма скарочана. Можна сабе ўявіць, якія кадры рыхтуе МТС.

Яшчэ горш у Мехаўскай МТС Гарадоцкага раёну. Там для работы па 20 ільнацерабілках трэба падрыхтаваць 35 чалавек ільнацерабільшчыкаў. Курсы, якія павінны былі пачацца з 1-га ліпеня, сарваліся, людзі не сабраліся.

Клясавыя ворагі вядуць шалёную барацьбу супроць мэханізацыі калгаснай вытворчасьці, у прыватнасьці, супроць церабленьня вядучай культуры ільну «Камсамолкамі». Гэтай агітацыі клясавага ворага ня процістаўпіцца масавая палітычная растлумачальная работа сярод калгасьнікаў. У выніку праўленьні калгасаў накіроўваюць на курсы ня лепшых ударнікаў, а гультаёў, ад якіх калгас хоча як мага хутчэй пазбавіцца. Зараз дырэктар Мехаўскай МТС Скуматаў мяркуе скліканць курсы на 10 дзён з 15 ліпеня, але падрыхтоўкі да іх ніякай не відаць. Скуматаў толькі яшчэ зьбіраецца ехаць у Гарадок прасіць дапамогі ў раённых арганізацый. Да рэчы, самі яны аб гэтым не здагадаліся, як быццам падрыхтоўка кадраў для мэханізаванай ільнаўборкі ня іх справа.

Ня лепш з падрыхтоўкай і іншых кадраў калгаснай вытворчасьці. З 10-га чэрвеня трэба было правесьці курсы старшынь калгасаў жанчын. Курсы сарваліся. Або курсы па сілаваньні. Трэба было падрыхтаваць 125 асоб у чатырох пунктах, але ні ў адным не сабраліся. Не праведзены таксама і курсы па аўладаньні сельгасмашынамі. А ўборка з кожным днём набліжаецца. Жыта налілося, пачало сьпець. Цьвіце лён.

Ня скончан рамонт машын. Не адрамантавана 9 бульбакапалак, 37 жнівярак, 15 касілак, 12 конных грабель і 95 малатарань.

Так у Гарадоцкім раёне «рыхтуюцца» да ўборачнай, малацьбы і выкананьня пляну паставак с.-г. прадуктаў дзяржаве.

Зусім спакойна паглядае на такія абураючыя факты загадчык райземаддзелу **Смоліч.**

—Так здаўна вядзецца ў Гарадку—заўляе ён.

Трэба спадзявацца, што новае раённае кіраўніцтва на чале з сакратаром РК КП(б)Б т. **Канавалавым** і старшынёй РВК тав. **Сурба** прыме меры для зьнішчэньня пакаданых «дробязей», якія награжаюць арывам уборкі, мабілізуе ўсю партарганізацыю на пасьпяховае правядзеньне ўборкі і паставак с.-г. прадукцыі дзяржаве.

А. М.

ТРАВЫ АДЦЬВІТАЮЦЬ

У МАГІЛЕЎШЧЫНЕ АДНААСОБНІКІ НЯ ВЕДАЮЦЬ, ДЗЕ ІМ КАСІЦЬ

МАГІЛЕЎ. Магілеўшчына адзін з асноўных жыўёлагадоўчых раёнаў БССР. Сваячасовае і добраякаснае правядзеньне сенаўборкі набывае тут асаблівае значэньне.

У раёне трэба скасіць 19.742 га сенажацый, 1386 га канюшыны і 240 га сеяных траў.

20 ліпеня ацэнкі тэрмін, вызначаны ЦК і СНК для сканчэньня сенаўборкі. Між тым скошана толькі 26 проц. сенажацый, а да касьбы траў і канюшыны яшчэ і не прыступалі. Травы адцьвітаюць.

У апошнія дні падворе спрыяла ўборцы, аднак, тэмпы работы на сенажацях застаюцца ганебнымі.

Райземаддзел сенаўборкай зусім ня кіруе. У раёне наглядаецца трубае ігнараваньне аднаасобнікаў. Большасьць аднаасобнікаў ня ведае, дзе ім трэба касіць. Толькі зараз райземаддзел пачаў адводзіць сенажаці аднаасобнікам. Штодзённа ў райвыканкам прыходзяць сотні аднаасобнікаў з просьбамі аб адводзе вучасткаў.

Ёсьць рад выпадкаў, калі калгасы сілай захватваюць сенажаці, адведзеныя аднаасобнікам. У Мастоцкім сельсавеце старшыня калгасу імя Сталіна захапіў 18 га сенажаці аднаасобнікаў і скасіў яе. Такія-ж факты захвату сенажацый аднаасобнікаў мелі месца і ў Мацінацкім сельсавеце. Аб усіх гэтых фактах райземаддзел ведае, але ніякіх мер ня прымае.

У першыя-ж дні сенаўборкі паглядаецца вялікі разрыў паміж касьбой і стагаваньнем. Са скошаных 26 проц. сенажацый толькі 7 проц. застагавана. Гэта пагражае вялікімі стратамі.

Н-ін.

ПЕРШЫЯ ДНІ ЗДАЧЫ СЕНА

КРЫЧАЎ. (БЕЛТА).

Крычаўская партарганізацыя паставіла перад сабой задачу — да 25 ліпеня поўнасьцю выканаць пляны сеназагатовак. Для арганізацыі загатовак ва ўсе сельсаветы выехалі ўпаўнаважаныя РК і РВК. 12 ліпеня пачалася масавая здача сена калгасамі. Калгасы Паланіцкага сельсавету здалі 19 цэнтн., Касьцюкоўскага — 22, Каанскага — 16, Міхеўскага — 15 і інш. **Калгас «Ленінскі прызыў» Паланіцкага сельсавету да 12 ліпеня поўнасьцю выканаў свае абавязкі перад дзяржавай па здачы сена.**

Трэба адзначыць, што калгасы здаюць дзяржаве прадукцыю выключна высокай якасьці, толькі калгас «Ленінскія дні» Паланіцкага сельсавету даставіў на пункт вельмі дрэнае сена (асака, вільготнае сена), якое ня было прынята. Гэты факт гаворыць аб тым, што ў гэтым калгасе яшчэ не ліквідаваны кулацкія тэндэнцыі.

Неабходна таксама адзначыць вельмі дрэнную падрыхтоўку пункту Загатэбожжа да прыёмкі сена. 12 ліпеня больш 40 фурманак з сенам з 9 гадзін раніцы да 2 гадзін дня чакалі, пакуль пункт пачне працу.

Падбудуем эскадрыльлю імя Кагановіча

МЕНСК. Адозва гомельскіх рабочых і калгасьнікаў аб пабудове эскадрыльлі імя Багановіча знайшла сярод рабочых Менску шырокае падтрыманьне.

* На заводзе «Ўдарнік» абгаварылі гэта пытаньне на агульным сходзе рабочых і пастанавілі 27-га адпрацаваць дзень на карысьць пабудовы эскадрыльлі імя Кагановіча.

* Рабочыя заводу імя **Варашылава** таксама парашылі адпрацаваць адзін дзень і сродкі перадаць на пабудову эскадрыльлі.

* Рабочыя і служачыя 6-га акалодку (Менск)—пасажырская МБВ адлічваюць 50 проц. дзеннага заработку ў фонд пабудовы эскадрыльлі і выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу ўсе акалодкі і кантору 8 і 32 дыстанцыі і прараба № 2.

АХОУВАЦЬ КОЖНАЕ ЗЕРНЯ, ЯК ВОКА

Багаты ўраджай азімых і ярыны ўжо сьпее. Жыта налілося зернем. Цьвіце лён. Неўзабаве па БССР пачнецца масавае жніво.

Пасьпяховы збор збожжа і пасьпяховае правядзеньне паставак с.-т. прадукцыі дзяржаве шчэ больш умацуюць магутнасьць краіны Саветаў, яшчэ больш паскораць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і палепшаць матар'яльна-бытавое становішча працоўных.

Чакаемы багаты ўраджай прыводзіць у ярасьць нашых клясавых ворагаў. Будучы разгромленымі, але канчаткова не дабітымі, яны ня склалі зброі, яны ўсякімі сродкамі, на кожным кроку прабуюць нам шкодзіць, прычым для гэтага яны выбіраюць найбольш слабыя нашы вучасткі.

У радзе раёнаў БССР за апошнія дні назіраюцца факты зладзейства, раскрадваньня саўгаснага і калгаснага збожжа і спробы псаваньня новага ўраджаю.

Клясавы вораг—кулак, шкоднік, зладзей, гультай працягвае сваю шкодніцкую руку да сацыялістычнай уласнасьці. З першых-жа дзён сенаўборкі ў радзе раёнаў **(Талачын, Менск, Ельск)** кулакі і зладзеі пачалі раскрадваць калгаснае сена. На палёх Віцебшчыны, зьявіліся кулацкія «парыкмахэры», якія стрыгуць калосьсі.

У большасьці выпадкаў арганізатары пакраж сацыялістычнага ўраджаю застаюцца ня выяўленымі і не пакаранымі.

Чаму?

Адказ на гэта пытаньне з усёй яснасьцю дае матар'ял, зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» 18-га ліпеня аб начным «налёце» праверкі аховы ўраджаю па калгасы Старасельскага сельсавету (Віцебшчына), арганізаваным брыгадамі друку.

Амаль па ўсіх калгасах гэтага сельсавету ахова сацыялістычнага ўраджаю, ахова калгаснай маемасьці пастаўлена зусім дрэнна. Ні аб'езчыкаў, ні вартавых на палёх і з ліхтаром ня знойдзеш. Ва многіх калгасах да аховы грамаджай уласнасьці адносяцца абыяк, глядзяць на гэта, як на лішнюю справу і гэтым толькі патураюць кулацкім элемэнтам у іх шкодніцкай і зладзейскай рабоце.

Чаго варты хаця-б такія факты, калі брыгады друку, пад носам у моцна спаўных вартавых, выводзілі кароў, коняй, выносілі зброю, машыны і іншую калгасную маемасьць (калгасы «Новае жыцьцё», «Свабода», «1 мая»). Адказьнейшую справу—ахову грамадзкай уласнасьці тут даручылі калекам, дзецям, старым і г. д. У некаторых калгасах у вартаўнікі пралезьлі варожыя калгаснаму ладу людзі.

Такое становішча з аховай калгаснай маемасьці мы маем ня толькі ў Віцебскім раёне. У Талачынскім раскрадваньне калгаснага сена ўвайшло ў сыстэму. Злачынцы ўвесь час застаюцца непакаранымі. Дрэнна з аховай ураджаю і ў Менскім раёне. Гэта паказаў нядаўні ірапэс над кулакамі-зладзеямі ў калгасе **імя Дзяржынскага.**

Начны рэйд па калгасах Віцебшчыны павінен паслужыць сыгналам для ўсіх іншых раёнаў і калгасаў БССР.

Па ініцыятыве правадыра партыі таў. Сталіна амаль год назад урад апублікаваў вядомы закон ад 7 жніўня аб ахове грамадзкай сацыялістычнай уласнасьці.

Высунуўшы бадзявы гістарычны лёзунг—«грамадзкая ўласнасьць сьвяшчонна і недатыкальна», накіраваўшы вострасьць пралетарскай дыктатуры супроць рэштак адміраючых эксплёататарскіх клясаў, закон гэты стаў магутнай зброяй пераробкі і перавыхаваньня ўчарайшых дробных уласьнікаў.

Але ці азначае гэта, што паяўнасьць такога закону дае права на самазаспакаеньне, на аслабленьне клясавай пільнасьці?

Ні ў якім разе. Наадварот, трэба максымальна скарыстаць той паварот да працы, да калгаснай маемасьці, які ёсьць сярод калгасных мас і накіраваць яго на арганізацыю найстрамжэйшай аховы грамадзкага дабра і ў першую чаргу—на пільнейшую ахову сацыялістычнага ўраджаю.

— Не дапусцім, каб рука кулака, шкодніка і гультая працягнулася да калгаснага дабра. Ад жніва і да сьпіна мы павінны наладзіць пільную ахову—вось бадзявая пудёўка, якую даў другі зьезд перадавікоў калгаснай вёскі Беларусі.

Гэты бадзявы лёзунг другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў павінен стаць здабыткам найшырэйшых мас калгаснага сялянства, кожнай калгаснай хаты, кожнага калгасьніка.

Задача заключаецца ў тым, каб ахову калгаснага ўраджаю сапраўды арганізаваць. Выключную ўвагу трэба зьвярнуць на падбор праверанных, чэсных, адданых калгаснаму ладу людзей спэцыяльна для аховы ўраджаю, людзей, якія-б адказвалі за ўлік, прыёмку і перавозку збожжа.

Зразумела, справа ня толькі ў вылучэньні людзей, якім даручаецца ахова, але і ў пастаянным кантролі над імі, як яны ахоўваюць.

Лепш за ўсё, калі ахова ўраджаю ўскладаецца на калгасную брыгаду, бо пастаянная вытворчая брыгада, якая непасрэдна зацікаўлена ў выніках сваёй працы, лепш за ўсё здолее гэту ахову арганізаваць. Гэта значыць, што ў справу аховы ўраджаю будуць уцягнуты ня толькі пасобныя людзі—аб'езчыкі, вартаўнікі і іншыя, якім гэта даручаецца, але і ўся маса калгасьнікаў.

Перадавыя калгасьнікі БССР у сваёй адозве правільна падкрэсьліваюць, што асабліва важна арганізаваць улік і ахову ўраджаю на таку, бо сюды, дзе зерне льецца шырокім патокам, лодыры і рвачы больш за ўсё працягваюць свае рукі.

— Ля кожнай малатарні паставіць вагі, не адвозіць без узважваньня ні аднаго кілёграму. Ахоўваць кожнае зерня як вока—вось абавязак кожнага сумленнага калгасьніка.

Такі паказ другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Пудёўка дана. Самае важнае заключаецца зараз у тым, каб на справу аховы сацыялістычнага ўраджаю ўзьняць увесь калгасны актыў, шматтысячную масу добрасумленных калгасьнікаў, каб з усёй сілай абрушыцца на тых, хто адважыцца пасягнуць на сьвяшчэнную ўласнасьць сацыялізму.

Нарада начальнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў

Учора адкрылася нарада начальнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў, скліканая ЦК КП(б)Б сумесна з палітсэктарам НКЗему.

Нарада заслухала даклады т. **Бэнэка і Жолудава** аб ходзе працолачнай і сенакосная кампаніі і падрыхтоўцы да ўборачнай і хлебаздачы і даклад тав. **Пынькава** аб рабоце палітаддзелаў МТС і саўгасаў.

У спрэчках выказаліся т. т. **Вайнман** (нач. палітаддзелу Рагачоўскай МТС), **Кукелка** (Старобін), **Макееў** (нач. палітаддзелу саўгасу Банонь), **Берзін** (Полацак), **Сапун** (Плешчаніцы), **Плаўнік** (Дрыса) і інш. Усе выступаючыя ў спрэчках начальнікі палітаддзелаў дзяліліся вопытам сваёй работы па падрыхтоўцы да ўборачнай і перабуцовы работы партыйных ячэек.

З вялікай прамовай аб задачах палітаддзелаў БССР выступіў сп

Па-бальшавіцку рэалізаваць пастановы партыі і ўраду аб чыгуначным транспарце!

АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ ПЕРАБУДОВЫ

(З прамовы т. А. А. Андрэева на сходзе партактыву Маскоўскага вузла 11 ліпеня 1933 г.)

Ня гледзячы на тое, што мы маем за апошні год дапейшы рост тэхнічных сродкаў: колькасьць паравозаў і вагонаў ня зьменшылася, а павялічылася, чыгуначная сетка ня зьменшылася, а павялічылася,—ня гледзячы на гэта, работа аслабла, работа упала: чыгункі працуюць горш, чым за той-жа перыяд мінулага году. Дзе прычыны такой дрэннай работы? На гэта пытаньне пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК дае ясны і вычарпальны адказ. Гэтыя прычыны ляжаць у дрэннай арганізацыі справы кіраўніцтва зьверху да нізу, у дрэннай арганізацыі справы кіраўніцтва транспартам.

Прычына заключаецца ў тым, што ў нас на дарогах дрэнна працуюць паравоз і вагон. Псаваньні паравозаў у нас яшчэ даволі значныя, павялічыліся ад цэпкі па наспраўнасьці вагонаў у дарозе, а такі стан з вагонам дэзарганізуе ўвесь рух, усю работу сеткі. А дрэнна працуюць паравоз і вагон таму, што па-ранейшаму яны дрэнна рамонтуюцца. Некалькі год назад былі зьмешаны ўмовы рамонту. Умовы рамонту паравозаў і вагонаў настолькі спрасьціл, што паравоз і вагон з рамонту выходзяць напоўздаровымі, і гэта спрашчэньне ў нас лічылася за мудрасьць, так званай «эканоміяй».

Паравозы і вагоны ў нас дрэнна працуюць таму, што ў нас да гэтага часу яшчэ ня зьнішчана, а пануе абязьлічка ў рамонце.

Догляд і рамонт дарожнай гаспадаркі таксама праводзіўся і да гэтага часу вядзецца з разьлікам як можна больш спрасьціць тыя тэхнічныя ўмовы, якія павінны былі быць захаваны ў рамонце і догляде дарогі.

Прычыны дрэннай работы ляжаць у крайняй слабасьці нашых рабочых нізавых зьвеньняў—дэпо, станцый, дыстанцый. Іменна на гэтыя зьвенні непасрэдна кладзецца надзвычай узрослая работа чыгунак. Іменна яны зьяўляюцца галоўнымі рабочымі органамі. Здавалася-б, што там і павінны быць сканцэнтраваны найбольш моцныя, здольныя людзі, тэхнічна пісьменныя для таго, каб гэту работу правесьці, з гэтай работай справіцца, а на справе гэтага няма.

Работнікаў нізавых зьвеньняў нашы апараты НКШЗ, дырэкцый і рэёнаў закідваілі бязьлітасна паперамі. Каман даваў той, каму толькі хацелася. І НКШЗ, і дарога, і рэён — усе лічылі сваім абавязкам бліжэй «зьвязацца» з нізамі і закідваць гэтыя нізы сваімі загадамі, распараджэньнямі, тэлеграмамі і г. д., а ў рэзультаце атрымалася, што запраўдная работай нізавому начальніку ня было калі займацца. Ён быў завален паперамі, загружан рознымі спраўкамі і загадамі, а сваю непасрэдную работу ён звальваў на другарадных асоб.

Прычына дрэннай работы чыгуначнай гаспадаркі заключаецца ў нізкай, слабай дысцыпліне на чыгунках.

Дысцыпліна працы на транспарце слаба яшчэ і таму, што няма да гэтага часу на транспарце запраўднай, бальшавіцкай рашучай барацьбы з подыранмі, з прагульшчыкамі. Аб тым, што большасьць гаспадарнікаў на чыгунках страціла бальшавіцкую чуласьць і пільнасьць да барацьбы з клясавым ворагам, сьведчыць той факт, што клясавы вораг прабіраецца нярэдка на самыя адказныя месцы для шкодніцкай работы па зруйнаваньні асобных частак транспарту і перш за ўсё для разлажэньня працдысцыпліны. Даволі ўказаць на той факт, што, напрыклад, на паўднёвай дарозе пры апошняй чыстцы было вычышчана кулацка-белагвардзейскіх элемэнтаў больш чым 6.000 чал., якія на дарозе, зразумела, займаліся не дапамогай, а разлажэньнем працоўнай дысцыпліны, псаваньнем рухомага складу, пралазячы ў змазчыкі, дарожныя вартаўнікі, кандуктары, пралазячы ў дыспэтчары, на адказныя пасты па руху, складаючы шкодніцкія графікі руху цягнікоў і г. д. А дзе-ж былі нашы кіраўнікі-гаспадарнікі, няўжо яны не маглі выкрыць твар клясавага ворага, адрозьніць яго ад пралетара? Гэта паказвае, наколькі нашы гаспадарнікі страцілі папітычную чуласьць, ператалі быць палітыкамі, ператварыліся ў вузкіх гаспадарнікаў.

Чаму і адкуль магла назбірацца такая вялізарная колькасьць недахопаў у чыгуначнай гаспадарцы? Гэта ня мэрнае пытаньне. Хто-ж нясе адказнасьць за такі стан чыгуначнай гаспадаркі? Хто нясе адказнасьць за вялізарнейшыя недахопы, непарадкі ў чыгуначным мэханізьме? Вінаваты і нясем цалкам і поўнасьцю адказнасьць за ўсё гэта мы—камуністы, работнікі чыгуначнага транспарту. Мы, работнікі гаспадарчых органаў НКШЗ і дырэкцый, рэйкаў, партыйных і прафэсыянальных

арганізацый,—мы нясем простую адказнасьць за ўсё гэта. Пастанова ЦК проста гаворыць аб тым, што «АДКАЗНАСЬЦЬ КЛАДЗЕЦЦА ПЕРШ ЗА ЎСЁ І ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ НА КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ АКТЫВІСТАЎ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ ЗЬВЕРХУ ДА НІЗУ. КАМУНІСТЫ І БЕСПАРТЫЙНЫЯ АКТЫВІСТЫ, І ТОЛЬКІ ЯНЫ ЗАКЛІКАНЫ КІРАВАЦЬ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ, ЯНЫЖ АДКАЗВАЮЦЬ ЗА ЯГО ПЕРАБУДОВУ, ЗА ПЕРАБОЙ Ў ЯГО РАБОЦЕ. ДРЭННАЯ РАБОТА КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ АКТЫВІСТАЎ—ТАКАВА КРЫНІЦА ДРЭННАЙ РАБОТЫ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ».

Што і як перарабіць і як перабудаваць—вельмі выразна паказана ў тэй баявой праграме, якою зьяўляецца пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК. Ясна, што мы павінны ў корані перагледзець усю практыку рамонту і тэхнічнага зьместу рухомага складу: паравозаў, вагонаў, шляху, чыгуначных пабудоў і г. д.

Ясна, што галоўную ўвагу мы павінны сканцэнтраваць на становішчы і рабоце экспляатацыйнай сеткі, абмежаваць сябе ў сэнсе ўсякага роду захапленьня новым чыгуначным будаўніцтвам. Ясная справа, што мы не адмаўляемся ад пабудаваньня новых чыгунак; мы будзем іх будаваць, рухаць новую тэхніку, абслугоўваць новыя раёны, але ўсё гэта нам прыдзецца ціпер рабіць у меру, і перш за ўсё выходзячы з забясьпечанасьці існуючай экспляатацыйнай сеткі тэхнічнымі сродкамі, рэйкамі, грашыма, людзьмі. Кожная выпушчэная рэйка, як і іншыя матар'яльна-фінансавыя сродкі, перш за ўсё павінны ісьці на ўмацаваньне існуючага шляху.

Мы павінны перабудаваць вельмі шпарка работу нашых раёнаў такім чынам, каб раёны заняліся выключна арганізацыйнай руху, а ня пуканьнем у воблаках. Работы па кіраўніцтве рухам цягнікоў у іх хопіць па горла, бо ў гэтай галіне нам трэба вельмі многае зрабіць, трэба прывесьці ў парадак, і каб раёны цалкам і поўнасьцю заняліся толькі гэтай работай. У дадатак да гэтага на раёны ўскладаецца невялікая работа на праверцы выкананьня аддаваемых апэрацыйных распараджэньняў з боку кіраўніцтва чыгункі па дэпо, станцыі і дыстанцыі, у мэтах зноў такі забясьпячэньня нармальнага руху цягнікоў.

Нам трэба ў корані перабудаваць сыстэму заработнай платы і нармаваньня працы, каб падцягнуць у апляце вядучыя прафэсіі. Перабудаваць зарплату так, каб аплата спэцыялістаў і практыкаў была тым вышэй, чым бліжэй яны знаходзяцца да вытворчасьці. Нам трэба перабудаваць усю сыстэму заработнай платы ў тым напрамку, каб гаспадаром гэтай сыстэмы быў непасрэдна нізавы адміністратар (начальнік дэпо, майстар, нач. станцыі і г. д.), каб гэта было яго простым абавязкам, а ня нейкіх нормовачных бюро або спэцыяльных тарыфнікаў з прафсаюзу, з гаспадарчых органаў і г. д. Тады ў нас будзе парадак.

Нам трэба сканцэнтраваць галоўныя і лепшыя сілы спэцыялістаў і практыкаў на лініі, калі мы хочам узьняць работу лініі. А узьняць яе мы павінны. Для гэтага трэба неадкладна адабраць, але не ў парадку нейкай агульнай мабілізацыі, на якую хочуць сасьлізнуць нашы паасобныя чыгуначныя арганізацыі, а ў парадку сур'ёзнага пільнага адбору лепшых сіл спэцыялістаў і практыкаў для ўмацаваньня работы нізавых зьвеньняў чыгуначнага транспарту.

Нам трэба з увядзеньнем палітаддзелаў перабудаваць усю палітычную работу на чыгуначным транспарце. Увядзеньне палітаддзелаў на чыгуначным транспарце мае вялізарнае значэньне. Палітаддзелы павінны рушыць сур'ёзна справу барацьбы за працдысцыпліну на чыгуначным транспарце, справу практычнай праверкі ўсіх людзей на чыгуначным транспарце. Палітаддзелы павінны рушыць справу аўладаньня камуністамі тэхнікай. Увядзеньне палітаддзелаў павінна моцна рушыць справу арганізацыі правядзеньня і праверкі выкананьня ўсіх мерапрыемстваў, бязьлітасна ўдарыць па ўсялякіх выпадках клясавага ворага і апартуністычных элемэнтаў. Увядзеньне палітаддзелаў таму будзе мець для транспарту вялізарнейшае значэньне. І чым хутчэй палітаддзелы арганізуюцца, тым хутчэй будзе палепшана работа нашага чыгуначнага транспарту.

Нам трэба пакончыць, таварышы, назаўсёды з падборам людзей НЕ ПА ДЗЕЛАВОЙ АДЗНАЦЫ.

Мы павінны выходзіць з таго, каб на чале справы стаялі ведаючыя людзі або прынамсі людзі, якія хочуць ведаць і вучацца справе, а не папулярныя людзі, ня людзі «добрыя», з партбілетам і з доўгім, добра прывешаным языком, якія ўмеюць вельмі добра балбатаць, гаварыць усякія прамовы, пісаць загады, але толькі не кіраваць справай.

Калі мы хочам казнаваццa бальшавікамі, а не прагніўшымі бюракратамі, мы павінны выпраўіць чыгуначны транспарт. Усе кіраўнікі-гаспадарнікі зьверху да нізу павінны ўявіць сабе тое, што ўсім нам дан вельмі сур'ёзны ўрок, мы пастаўлены пад вельмі сур'ёзную праверку. Трэба зразумець, што партыя далей не дапусьціць кіраваць транспартам так, як кіравалі да гэтага часу.

Я запытваў некалькіх таварышоў дырэктароў, як у іх справа пойдзе цяпер з правядзеньнем пастановы. Адказваюць: «Да мы,—гаворыць,—да 15-20 чыс па ўсё скончым». Чаму так хутка? «Да што-ж нам, мы ўсё намецілі, усё расставілі, застаецца аддаць загад, і ўсё гатова». Не, таварышы, так праводзіць нельга. Гэта ёсьць фармальныя адносіны да справы. Гутарка ідзе не аб тым, каб усё расставіць па палічках, не аб фармальным правядзеньні пастановы, а пытаньне пастаўлена аб карэннай пераробцы ўсіх мэтадаў нашага кіраўніцтва, ня толькі аб расстаноўцы людзей, а аб іх пераробцы, навучыць людзей працаваць па-новаму. Гутарка ідзе аб глыбокай перабудове ўсіх мэтадаў кіраўніцтва і аб пераробцы людзей зьнізу да верху, каб справу павесьці па-новаму, дакладна адбіраючы людзей, а не аб тым, каб фармальна, па расьпісанькі выканаць адпраўку столькіх-та чалавек на лінію.

Як бачыце, нямала рознастайных спроб, прачытаючы пастанову ЦК і СНК, затрымацца на старых пазыцыях, але на ўсё гэта трэба сказаць проста, што ніякіх паблажак і ўступак гнілой сыстэме і яе абаронцам ня будзе. Тыя камуністы, якія ня хочуць перабудавацца, як гэтага патрабуе пастанова ЦК і СНК, могуць сябе паставіць ня толькі па-за транспартам, але і па-за партыяй. Многім не паздарозіцца пры правядзеньні пастаноў ЦК і СНК, але партыя свае пастановы правядзе да канца, а мы, бальшавікі-камуністы на чыгуначным транспарце, павінны лічыць для сябе справай гонару хутка і рашуча правесьці перабудову ўсёй работы чыгунак і даць партыі поўныя гарантыі, што работу чыгуначнай гаспадаркі мы выправім, падцягнем так, каб чыгуначны транспарт ня толькі не тармазіў бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу, але быў-бы яго магутным рухавіком.

Апаратчыкі аршанскага чыгуначнага раёну сабатуюць пастановы СНК і ЦК

ВОГША, 17. (Наш кар.).

На апошнія пастановы партыі і ўраду аб транспарце рабочыя чыгуначнікі Аршанскага вузла адказалі ня толькі словамі прыўітаньня і ўхваленьня, але і канкрэтнай справай па зьніччэньні расхлябанасьці, недысцыплінаванасьці, што мела месца ў рабоце.

5 ліпеня, у дзень, калі была атрымана пастанова ЦК і СНК, парткалектыў Аршанскага дэпо арганізаваў да поўскі мітынг. Ужо на гэтым мітынгу перадавыя кадравікі-чыгуначнікі, камуністы і беспартыйныя актывісты выступілі з радам канкрэтных прапаноў па паляпшэньні сваёй работы.

— Пастанова ЦК і СНК гэта якраз тое, што нам трэба,—сказаў па зьлёце адзін з лепшых ударнікаў дэпо **Іваноў**.

Цэх абточкі, дзе тав. **Іваноў** зьяўляецца групаргоргам, узяў на сябе абавязак — быць паказальным цэхам. І гэты абавязак рабочыя выконваюць з гонарам. Калі за мінулы месяц да 15-VI было 2 паўторныя рамонты, то ў ліпені іх зусім ня было.

Зрух ёсьць ня толькі па цэху абточкі. Разгорнутая масава-растлумачальная работа па папулярызацыі пастановы ЦК і СНК дала сябе адчуваць і на іншых вучастках работ дэпо.

Прагулы зьніжаны. За апошні час ня было ні аднаго псаваньня ў дарозе. Калі за месяц да 15 чэрвеня было 8 проц. зрыву спаранай язды, то ў наступныя 30 дзён процант зьменшыўся да 4. У мінулым месяцы сьледваньне цягнікоў па раскладзе срывалася на 50 проц., ў апошнія-ж дні спазьненьні ня маюць месца.

Ясна, што гэта толькі першыя крокі. 15 ліпеня ў дэпо закончана арганізацыя вытворчых брыгад, прыступлена да перагляду норм (іх па дэпо было да гэтага часу 8.000!), распачала працу атэстацыйная камісія.

Далёка не такі малюнак можна бачыць у апараце трэцяга экспляатацыйнага раёну. Там людзі не сьпяшаюцца, разважаюць, засядаюць, спрачаюцца, а выразнае канкрэтнай справы зацягваюць.

Яшчэ 13 ліпеня ўсе парторгі аддзелаў раёну і нават некаторыя начальнікі аддзелаў **(Якаўлеў)** у адзін голас заяўлялі, што:

— Нам абсалютна нічога невядома, як і што трэба рабіць.

І нічога не рабілі, а калі і рабілі, то не заўсёды тое, што трэба.

Амаль уся увага кіруючых работнікаў раёну была сканцэнтравана толькі на пытаньні перакідкі і выкарыстаньня кадраў. Начальнікі аддзелаў больш за ўсё клапаціліся аб тым, хто і куды будзе прызначан і як у каго ў сувязі з гэтым зьменіцца зарплата. Такія-ж пытаньні, як папулярызацыя пастаноў партыі і ўраду сярод інжынэрна - тэхнічнага персаналу, узмацненьне дысцыпліны і г. д., пытаньні зьвязаныя з асеньня-зімовымі перавозкамі адышлі на задні плян.

Трэба адзначыць, што і ў справе разьмеркаваньня кадраў дапушчаны грубыя памылкі. **Нізавыя зьвенні засталіся не ўмацаванымі. З 51 ІТР на Лепельскую лінію і на малыя станцыі не накіравана ні аднаго чалавека.**

Начальнік б. аддзелу кадраў **Грушанаў** тлумачыць гэта тым, што «ня было дакладных указаньняў аб укамплектаваньні», але, як відаць, прычына ня ў гэтым.

Напрыклад, былы начальнік аддзелу шляху, прызначаны зараз начальнікам дыстанцыі шляху, амаль усіх (прынамсі, лепшых) людзей з аддзелу забраў да сябе ў кантору дыстанцыі. Тое-ж самае зрабіў былы начальнік аддзелу сувязі. Такім чынам людзі перамянялі шыльды, а сутнасьці справы не закранулі.

Ня гледзячы на адсутнасьць належнай растлумачальнай работы сярод ІТР, рад лепшых інжынэраў і тэхнікаў **(Вечар, Пачаеў, Казловіч** і інш.), не чакаючы прызначэньня, падалі заявы аб пераводзе іх у нізоўку. Аднак, гэта толькі адзін бок медалі. Адзін з парторгаў аддзелу—**Васільлеў** нават і не паспрабаваў растарнуць у сваім аддзеле работы ў гэтым напрамку:

—Мы баяліся, што ўсе нашы спэцыялісты захочуць на лінію...

А начальнік аддзелу працы т. **Якаўлеў** у сваіх разважаньнях зайшоў яшчэ далей...

—Няўжо вы хочаце, каб усіх інжынэраў накіраваць на станцыі тэлеграфістамі, а тэлеграфістаў паставіць у рабоце інжынэрамі (?!)...

Цяжка паваротваюцца апаратчыкі ў насіджаных месцах бюракратызму. Трэба навучыцца ў рабочых чыгуначнікаў як трэба адказваць на заклік сваёй партыі, свайго ўраду.

В. Д

На лінію ня выехаў 1 інжынэр і 4 тэхнікі

ВОРША, 18. Ня гледзячы на тое, што праведзена разьмеркаваньне інжынэрна-тэхнічных работнікаў райкіраўніцтва на нізавых вытворчых адзінках, да гэтага часу многія з іх яшчэ не прыступілі да працы. Прапуе яшчэ ў апараце райкіраўніцтва інжынэр **Ларын**, які прызначан наглядчыкам будынку і грамадзянскіх пабудоў дыстанцыі шляху **Барысаў**. Не зьявіўся на працу былы начальнік будаўнічага аддзелу райкіраўніцтва **Сільноў**, які прызначан намесьнікам начальніка дыстанцыі шляху Ворша. «Адседжваецца» яшчэ ў апараце тэхнік **Кодар**, прызначаны ў вагоннае дэпо Ворша і два практыканты, прызначаныя ў дыстанцыю сувязі Мепок. Раённае кіраўніцтва, прафарганізацыя ня прымаюць меру у адносінах да гэтых сабатажнікаў, пастановы СНК і ЦК.

СКОНЧЫМ РАМОНТ ДАРОГ ДА ПАЧАТКУ ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Паасобныя дарогі будуць у гэтым годзе выраблаць посьпех уборкі ўраджаю з найменшымі стратамі і справу збожжаздачы. Становішча пад'язных шляхоў будзе таксама ў значнай ступені ўплываць на нармальную работу ільна-пяньковых, броварных, крухмальна-патачных заводаў і МТС. У большасьці гэтыя дарогі адносяцца да так званых мясцовых дарог, раённага і сельскага значэньня.

Ці карыстаюцца мясцовыя дарогі з боку раённых і сельскіх саветаў, партыйных і грамадзкіх арганізацый той увагай, якую ім трэба аддаваць?

Паасобныя факты паказваюць, што гэта частка дарожнай гаспадаркі выпала з поля зроку мясцовых арганізацый. Тракт Глуск—Ратміравічы,—адзіная дарога, якой раён зьвязан бліжэйшым шляхам з чыгуначнай станцыяй і збожжаздатачным пунктам. Сучаснае становішча дарогі выклікае сур'ёзную трывогу. Калі да пачатку збожжаздачы яе не прывядуць у парадак, яна можа выклікаць затрыманьне ўсяго грузапатоку раёну.

Што-ж робяць **Глускі** РВК і РК КП(б)Б для таго, каб арганізаваць нармальны пропуск збожжа і бульбы па гэтай дарозе? Вельмі мала. Карпілаўскі і іншыя сельскія саветы, якія распаложаны ўздоўж гэтага тракту, сарвалі выхад рабгужсілы. Працудзел насельніцтва выкарыстан толькі на 25 проц. Раскачка раённых арганізацый, якая была ў часе прыезду прадстаўніка Галоўдартрансу, цягнулася ўсяго... адзін дзень. Пабудова пад'езду да станцыі Ратміравічы фактычна знаходзіцца пад пагрозай зрыву. РВК і РК абавязаны прыняць запраўдныя захады, каб забясьпечыць пабудову ня толькі гэтага тракту, але і выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб 100-процантным выкарыстаньні да 1 жніўня працудзелу насельніцтва ў дарожным будаўніцтве.

Тракт Вузда—Негарэлае мае выключнае эканамічнае значэньне для **Вузьдзенскага** раёну, бо ўвесь паток грузаў з раёну цалкам накіроўваецца на ст. Негарэлае. Становішча-ж гэтай дарогі, асабліва на тэрыторыі Дзяржынскага раёну, выключна дрэннае. І недарма цэнтральны штаб па дарожным будаўніцтве падкрэсьліў, што **«кіруючы склад Дзяржынскага раёну не забясьпечыў апэрацыйнага кіраўніцтва ходам дарожнага будаўніцтва, на мабілізаваў грамадзкасьці на выкананьне пляну, ня ўжыў адпаведных мер для рэалізацыі пастаноў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па дарбудаўніцтву».** План выхаду рабгужсілы выканан толькі на 46,8 проц., а да тэрміну, устаноўленага для скончэньня работы, засталіся лічаныя дні.

Час, які яшчэ застаўся, павінен быць максымальна выкарыстан для таго, каб скончыць пабудову асноўных маршрутаў. Уся рабгужсіла раёну, вольныя трактары МТС павінны быць накіраваны на ліквідацыю прарыву. Старшыня РВК тав. **Вансоўскі** па наслядженьні цэнтральнага штабу заявіў, што ўвесь працудзел будзе на раёну ў тэрмін выкарыстан. Трэба спадзявацца, што для выкананьня гэтай задачы РВК і РК прымуць запраўды апэрацыйныя і арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы.

Трэба адзначыць поўную бязьдзейнасьць Дзяржынскай МТС у дарбудаўніцтве. У той час, калі, згодна пастановы ўраду, яна павінна была адпрацаваць 264 трактарадні, на 15 ліпеня яна не адпрацавала ні аднаго дня. Дзяржыцкая МТС імкнецца ўсякімі спосабамі ўхіліцца ад выкананьня сваіх абавязацельстваў, а між тым масавая ўборка ня будзе чакаць, дарогі.

***

Ня гледзячы на тое, што ў Расонах знаходзіцца МТС і ільназавод, пад'езд да станцыі ў вельмі дрэнным становішчы. І гэта пад самым носам кіруючых арганізацый раёну. А што робіцца на астатніх мясцовых дарогах раёну — паказвае сам процант выкананьня працудзелу — 27,5.

***

Чачэрскі раён увесь час зрывае дарожнае будаўніцтва. На 15 ліпеня плян будаўніцтва дарог мясцовага значэньня выкананы толькі на... 6,4 проц. Да гэтага часу ня выдана пастанова РВК аб працудзеле, не абвешчан месячнік штурму, дарожныя работнікі пастаўлены ў вельмі дрэнныя ўмовы працы (дрэннае забесьпячэньне, адсутнасьць дапамогі і г. д.). Для мясцовых савецкіх і партыйных арганізацый, відаць, не зьяўляюцца абавязковымі пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб месячніку штурму бездарожжа. Замест напружанай работы, якая-б забясьпечыла ліквідацыю папўнага ганебнага прарыву, ёсьць «панскія» адносіны да гэтай справы. У выніку кожная пяцідзёўка дае прырост усяго толькі на 1-2 проц., замест патрэбных 20 проц. Неадпаразовыя ўказаньні цэнтральнага штабу аб зрыве дарожных работ па Чачэрскаму раёну не зрабілі ўплыву на райарганізацыі, якія апартуністычна недаацэньваюць прывядзеньня ў парадак дарог да ўборачнай кампаніі.

Раўніцца трэба па **Пухавіцкаму** раёну, які за месячнік штурму паказаў запраўды бальшавіцкія тэмпы ў рабоце. З пяцідзёўкі ў пяцідзёўку набіраючы тэмпы ў выхадзе рабгужсілы, раён 15 ліпеня рапартаваў аб выкананьні пляну будаўніцтва мясцовых дарог на 102 проц. І агульнага выкарыстаньня працудзелу на 115 проц. Дзяжуючы разгорнутай масавай рабоце, добрай расстаноўцы сіл, пры непасрэдным апэрацыйным кіраўніцтве ходам дарожных работ з боку РК КП(б)Б і РВК—дарогі раёну поўнасьцю падрыхтаваны да ўборачнай кампаніі. Цэнтральны штаб адзначыў посьпехі Пухавіцкага раёну ў дарбудаўніцтве і выдзеліў 2.500 руб. для прэміяваньня лепшых перадавікоў. Старшыня РВК т. **Ступакоў**, сакратар РК КП(б)Б т. **Тарасаў** і начальнік райдарадзелу т. **Віньнікаў** прэміраваны каштоўнымі падарункамі.

Неабходна замацаваць дасягнутыя посьпехі, закончыць асобныя маршруты, наладзіць пастаянны догляд пабудаваных дарог, прымацаваць іх да асобных калгасаў, саўгасаў і вёсак у парадку шэфства, наладзіць такую работу па экспляатацыі дарог, каб яны засталіся праезджымі па працягу ўсяго году.

Значна ўзросшая таварнасьць сельскай гаспадаркі, яе тэхнічнае ўзбраеньне, канцэнтрацыя вытворчасьці ў саўгасах і калгасах, усё ўзрастаючая колькасьць МТС і заводаў, якія перарабляюць сельска-гаспадарчую прадукцыю, выклікаюць значную патрэбнасьць у добрых дарогах, патрабуюць, каб гэтыя дарогі былі заўсёды праезджымі.

Іменна ўлічваючы гэта, ЦК КП(б)Б і СНК БССР з 1 ліпеня абвясьцілі месячнік штурму бездарожжа. Хоць яго, як паказваюць прыведзеныя факты, па асобных раёнах настолькі нездавальняючы, што месячніку пагражае зрыў. Застаўся вельмі кароткі час. Прапушчанае трэба нагнаць. З усёй бальшавіцкай напорыстасьцю трэба памножыць тэмпы дарбудаўніцтва, даць праезд па ўсіх дарогах БССР новаму ўраджаю, у тэрмін выканаць пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Г.

Брыгада „Зьвязды"—Чавускі, Вайкавыскі, Бутомаў

ЛЕПШЫЯ ТАВАРЫ—ПЕРАДАВІКАМ УБОРКІ І ЗАГАТОВАК

(УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС ССТ І МІЖРАЙБАЗ)

Нядаўна скончылася ўсебеларуская нарада адсталых сельспажыўтаварыстваў, якія не перабудавалі сваёй работы адпаведна дырэктывам партыі і ўраду, ня адолелі падпарадкаваць сваю гандлёвую дзейнасьць задачам узьдыму калгаснай вытворчасьці.

Задача нарады была—падвесьці вынікі першага этапу ўсебеларускага конкурсу, вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па разгортваньні другога этапу конкурсу з тым, каб ліквідаваць адставаньне раду райспажыўсаюзаў і ССТ і перанесьці ў іх работу лепшыя ўзоры працы перадавых каапэрацыйных арганізацый.

Даклады сельспажыўтаварыстваў і выступленьні ў спрэчках на нарадзе ускрылі запраўдныя прычыны адставаньня каапэрацыйных арганізацый у разгортваньні тавараазвароту, ў абслугоўваньні веснавой сяўбы. Многія арганізацыі не ўсьвядомілі дырэктыў партыі аб разгортваньні савецкага гандлю. Завоз тавараў не будаваўся на аснове ўліку попыту спажыўца, тавараспажэньне ня было падпарадкавана задачам пераможнага завяршэньня сяўбы.

Той факт, што адбор тавараў па базах быў даручаны ва многіх ССТ фурманшчыку, досыць выразна харак гарызуе адносіны нізавых арганізацый да патрабаваньняў спажыўца. Нават пры пакупцы мануфактуры работнікі каапэрацыі ня цікавіліся асартыментам. Зараз, у разгары поліва, каапэрацыі ўборкі, завозяць на вёску мануфактуру асартыменту, патрэбнага зімой. У сельспажыўтаварыствы Лёзьнянскага раёну завезена 65 кіп мануфактуры выключна аднаго гатунку і колеру—малескін. Зусім правільна заявілі калгасьнікі калгасу «Савецкая Беларусь»: «Навошта нам патрэбна такая мануфактура? Няўжо галавацыны ня ведаюць, што зараз для работы ў полі нам патрэбна лёгкая тканіна».

Ганебна нядбайна трымаюцца тавары ў крамах. Тавар часта звальваюць у адну кучу, або кідаюць пад прылавак, яго прападносяць спажыўцу ў такім выглядзе, што адпадае ўсякае жаданьне купляць тавар.

Замест таго, каб будаваць тавараспажэньне па прынцыпу **«ударнікам вытворчасьці—ударнае снабжэньне»**, у некаторых сельспажыўтаварыстваў займаюцца даўно асуджаным мэтадам браніраваньня таварных фондаў. Гэта прыводзіць да затаварваньня, да зрыву выкананьня пляну тавараазвароту.

У сельспажыўтаварыствах **Буда-Кашалёўскага** раёну амаль увесь тавар забраніраваны, такія-ж фонды створаны і па **Лёзьнянскім раёне.** Такім чынам дырэктывы партыі аб разгортваньні савецкага гандлю ў гэтых раёнах, а таксама ў Чашніках, Петрыкаве, Мазыры ня ўлічаны і не ажыцьцяўляюцца.

Не ліквідаваны яшчэ дагэтуль лявацкія спробы мэханічнага разьмеркаваньня тавараў. Замест таго, каб гандляваць па-савецку, каб разгортваць тавараазварот шляхам наближэньня гандлю да вытворчасьці, шляхам задавальненьня попыту спажыўца, некаторыя каапэратары пашлі па лініі найменшага супраціўленьня—пачалі ўжываць прымусовы асартымэнт. Ліхаўскае сельспажыўтаварыства, **Асіпавіцкага** раёну пры продажы запалак навязвае бляшкі да падвязак, бяз іх запалкі не выдаюць. Некаторыя сельспажыўтаварыствы Буда-Кашалёўскага раёну дадумаліся да таго, што пры продажы гарэлкі прымушалі браць кнігі. Ці трэба даказваць, што такія мэтады работы да памагаюць толькі клясава-варожым элемэнтам, якія імкнуцца падарваць савецкі гандаль.

Чаму рад сельспажыўтаварыстваў перажывае зараз цяжкасьці ў збыце тавараў, а таксама фінансавыя затрудненьні? Гэта вынік таго, што **кіраўнікі ССТ не перабудавалі сваёй работы, ня ўлічылі зьмен у попыце спажыўца—калгасьніка, які патрабуе сёньня тавар лепшай якасьці і больш разнастойнага асартымэнту.** Сельспажыўтаварыствы ні ў якім разе ня выканаюць пляну тавараазвароту, працуючы старымі даўно асуджанымі мэтадамі, не перабудаваўшы сваёй работы.

У пагоні за прыбылямі, за больш «лёгкім» гандлем многія сельспажыўтаварыствы ігнаруюць такія тавары, як газа, соль, запалкі і інш. Гэта выклікае зусім законныя скаргі пайшчыкаў на дрэннае абслугоўваньне іх з боку спажывецкай каапэрацыі. Нельга дапусьціць, каб **сельспажыўтаварыствы адмаўляліся гандляваць такімі гаспадарчымі таварамі, якія вельмі патрэбны калгасьнікам, толькі таму, што гэтыя тавары не даюць вялікіх прыбыткаў.**

Неабходна, каб кожнае сельспажыўтаварыства закупляла ня толькі дэфіцытныя тавары, але гаспадарчыя рэчы; культурныя тавары, галянтарэю і іншыя рэчы, патрэбныя спажыўцу. Зусім недапушчальна, калі нізоўка зводзіць усю сваю работу да гандлю востра-дэфіцытным таварам. Гэта паказвае на нежаданьне ССТ пакланяцца аб поўным задавальненьні патрэбаў спажыўца і прыводзіць да зьніжэньня тавараазвароту.

Вялікую ролю ў арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаваньні ССТ адыгрывае **гаспадарчы разрахунак.** Шмат якія райсаюзы груба парушаюць дырэктывы партыі аб узмацненьні ССТ —асноўнага гандлёвага зьвяна на вёсцы. Пытаньнем калькуляцыі і рас цэнак тавараў часта займаюцца самі райспажыўсаюзы, яны гэтым — абмяжоўваюць гаспадарчую ініцыятыву нізоўкі. Сельспажыўтаварыствы ня ведаюць, як яны працуюць, і гэта зьяўляецца адной з прычыны нерэнтабэльнасьці вясковай сеткі і гандлёвай работы са стратамі.

Па сельспажыўтаварыствам Віцебскага раёну ў першым квартале былі страты ў 22 тыс. руб., па Бягомльскім раёне—35 тыс., па Петрыкаўскім — 30 тыс., па Асьвейскім — 13 тыс. і г. д.

Няправільна будуюцца ўзаемаадносіны паміж райзагамі і сельспажыўтаварыствамі. Ёсьць рад выпадкаў, калі райзагі ўвесь прыбытак па загатоўках забіраюць сабе, а сельспажыўтаварыствы выводзяць балянсы са стратамі.

Узаемаадносіны **райзагаў і сельспажыўтаварыстваў ў галіне загатовак** навінны будавацца на **строга-дагаворных пачатках,** у дагаворах трэба агаварыць, які процант прыбытку атрымоўваюць сельспажыўтаварыствы за праведзеныя загатоўкі.

Задача ўмацаваньня фінансавай гаспадаркі спажывецкай каапэрацыі патрабуе **рашучай барацьбы за скарачэньне выдаткаў звароту.** Па Гарадоцкім раёне спажывецкая каапэрацыя мае перавыдатак за 1 квартал ў 12600 руб., па Петрыкаўскім—у 35 тыс., па Бягомльскім—у 34 тысячы руб.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на **скарачэньне выдаткаў па гужу.** Мы часта сутыкаемся з фактамі кулацкага пацыходу паасобных калгасаў да перавозкі грузаў сельспажыўтаварыстваў. Праўленьні калгасаў прадаўляюць рвацкія патрабаваньні да каапэрацыі, а каапэратары не змагаюцца з рвачамі, плоцяць, колькі з іх патрабуюць.

Трэба прыцягваць да адказнасьці кіраўнікоў тых сельспажыўтаварыстваў і калгасаў, якія ўздуваюць цэны за перавозку. Трэба дапамагчы сельспажыўтаварыствам заключыць дагаворы з калгасамі па перавозку тавараў. Трэба скарыстаць вопыт паасобных раёнаў, дзе **самі пайшчыкі прапанавалі ўнесьці спэцыяльныя ўзносы на арганізацыю ўласнага транспарту каапэрацыі.** Паасобныя сельспажыўтаварыствы, як Роска-Сялецкае, Сераднякоўскае, Ціхавіцкае дабіліся заключэньня дагавораў з калгасамі на дастаўку тавараў па ільготных тарыфах. Гэты вопыт павінен быць скарыстаны па ўсіх сельспажыўтаварыствах БССР.

Наглядаюцца яшчэ ў радзе выпадкаў спэкуляцыйна-пэрманскія тэндэнцыі, якія выяўляюцца ў закупцы тавараў па павышаных цэнах, у продажы бракаванай прадукцыі, у, напля вацольскіх адносінах да патрабаваньняў спажыўцоў. Многія сельспажыўтаварыствы ў першым квартале затаварыліся прад

ЧЫСТКА ПАРТЫІ

АПРАУДАЦЬ ПАЧЭСНАЕ ІМЯ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА

Вынікі чысткі парткалектыву заводу «Бальшавік» прадстаўляюць вялікі інтарэс, бо справа ідзе аб партарганізацыі аднаго з буйных нашых прадпрыемстваў, узнагароджанага Чырвоным Сцягам.

Перш за ўсё застановімся на агульных выніках пэрсанальнай чысткі. Усяго праверана 208 чалавек, з якіх з партыі выключана — 29 чалавек, 25 партыйцаў пераведзена ў кандыдаты, 23 кандыдаты партыі пераведзена ў спачуваючыя.

Што-ж паказала чыстка гэтага парткалектыву?

Партыйная арганізацыя заводу, якая налічвае значную колькасць стойкіх бальшавікоў, здольных весьці за сабой рабочыя масы, мае рад бясспрэчных дасягненьняў. На працягу 1930-32 году завод сыстэматычна выконвае прамфінплян як па колькасных, гэтак і па якасных паказальніках. Завод мае посьпехі ў асваеньні новых відаў сыравіны (апрацоўка сьвіных скур, скарыстаньне хромавых стружак), у арганізацыі спэцыяльнага цэху па апрацоўцы прадметаў шырокага спажываньня, у стварэньні харчовай базы заводу.

Разам з гэтымі дасягненьнямі чыстка выявіла і вельмі сур'ёзныя недахопы як у гаспадарчай працы, так, асабліва, ва ўнутрыпартыйнай працы парткалектыву.

На працягу 1-га кварталу 1933 году павысілася сабекаштоўнасьць прадукцыі на 193.000 рублёў. Рад брыгад заводу, у прыватнасьці клееварнага цэху, ня маюць сапраўднага гаспадарчага разрахунку; па выдзельнічыпу пераведзена толькі 76 проц. рабочых. Дрэнна настаўлена вядзеньне гаспадаркі на складзе сырцу, дзе яшчэ пануе абязьлічка, сырэц не сартуецца па плотнасьці. Зусім ня ўжываюцца меры ўнутрызайчаньня на пастаўчыкоў сырцу, у выніку чаго досыць часта пастаўляецца сырэц нізкай якасьці.

Як-жа здарылася гэта па чырвонасьцяжным заводзе «Бальшавік»? Гэта здарылася таму, што кіраўніцтва заводу над уплывам ранейшых і сучасных посьпехаў у барацьбе за прамфінплян—захварэла на «зазнайства», на своеасаблівае «головокружение от успехов», яно палажылася на самацёк.

Вельмі павучален той пералом, які намеціўся ў ходзе чысткі ў справе перамаганьня гэтага слабага зьвіна —завод дабіўся за квартал зьніжэньня сабекаштоўнасьці на 43.000 руб. Гэты пералом паказвае, якія невычарпальныя магчымасьці для бальшавіцкай барацьбы за выкананьне вытворчых плянаў маюцца на нашых сацыялістычных прадпрыемствах, пры ўмове бальшавіцкай арганізацыі вытворчага энтузіязму і творчай ініцыятывы рабочых мас.

Надзвычай характэрныя моманты ўскрыліся пры праверцы ўнутрыпартыйнай работы на заводзе.

Партыйны калектыў ня ведаў сапраўднага твару камуністаў, сацыяльнага складу ўсяго калектыву. Гэта ярка паказвае той факт, што 20 проц. парторгаў зьяўляліся клясава чужымі людзьмі. Паасобныя з іх, карыстаючыся клясавай сьлепатой парткіраўніцтва заводу, пралезьлі нават у бюро парткалектыва (член бюро Шыменчык, парторгі — Левінсон, Плісан і інш. — былыя гандляры).

Якім чынам праводзіўся на заводзе «Бальшавік» прыём у партыю? Тут асабліва выразна праявіліся небальшавіцкія адносіны да прыёму новых членаў у нашу партыю. І гэта зусім невыпадкова.

Напрыклад, выступае на чыстцы былы бундавец і кажа: «што вы хочаце, ён быў гандляром, але яму ня было чым займацца і ён павінен быў пайсьці гандляваць на базар». Выявіўся рад фактаў, калі прымалі ў партыю былых гандляроў, бо лічылі, што ў іх ня было іншага выхаду, як толькі гандляваць. Тут сказваўся дробна-буржуазны, бундаўскі падыход, быццам можна прымаць у партыю былых гандляроў у сувязі са спэцыфічнымі ўмовамі ўройскіх мястэчак.

У. І. Ленін патрабаваў выключнай клясавай пільнасьці да пытаньня прыёму новых членаў у партыю. А на заводзе «Бальшавік» досыць часта прымалі ў партыю, не вывучаючы ўсебакова сацыяльнага твару прымаемых, ганяючыся толькі за колькасьцю (перагнаць завод «Камунар»).

Пасьля ўсяго сказанага зразумела, якім чынам пралез у партыю Шпарберг, ня гледзячы на тое, што факт яго гандлярства быў вядомы сакратару цэх'ячэйкі Фурману. Сын гандляра Плісман таксама быў прынят у партыю і яму была даверана работа рэдактара штодзённі і парторга.

Характэрна, што паасобныя члены партыі не дапамагалі ўскрываць чужых партыі людзей і камісіі прыходзілася ўжо ў другі раз зварочвацца да паасобных кандыдатур. Калі на сходзе выкрыўся твар гандляра, спэкулянта Шыменчыка, сакратар парткалектыву тав. Гелер замест таго, каб даць бальшавіцкую ацэнку гэтаму клясаваму ворагу, пачаў хваліць Шыменчыка, як майстра, спасылаючыся на тое, што мінулае Шыменчыка яму невядома. Паводзіны т. Гелера ў даным выпадку былі яўна антыпартыйнымі. Аб'ектыўна гэта ёсьць нішто іншае, як перажытак бундызму (тав. Гелер у 1917-18 г. г. быў у Бундзе, у 1919 годзе ўступіў у кампартыю).

Усе гэтыя факты яскрава сьведчаць, што ў пытаньнях прыёму ў партыю на заводзе «Бальшавік» мела месца прытупленае бальшавіцкай пільнасьці. У выніку гэтага — вялікая засьмечанасьць партарганізацыі клясава-варожым элемэнтам: праверкам выключана з партыі адных толькі гандляроў і выхадцаў з сем'яў гандляроў — 17 асоб.

Барацьба, якая вялася парткалектывам з контр-рэвалюцыйным трацкізмам досыць часта насіла непасьлядоўны, недастаткова завостраны характар; так, напрыклад, трацкіста Габэля паслалі ў Ленінград на вучобу з мэтай пазбавіцца ад яго як ад трацкіста; другіх трацкістаў заігчалі ў лік ударнікаў і г. д.

Партыйная арганізацыя ня выкрыла праяў правага апартунізму з боку члена партыі Шырая. Не вялася барацьба з пераражэнцамі тыпа Ўсціцінава, які жаніўся на дачцы палкоўніка і даў паручальства за шпіёнку.

У жыцьці рабочага калектыву меў месца шэраг антысэміцкіх і шавіністычных вылазак, што сьведчыць аб невыстарчальнай рабоце партарганізацыі па інтэрнацыянальным выхаваньні рабочых.

Большая частка партыйцаў, асабліва кандыдатаў, аказалася зусім палітычна непісьменнай, многія камуністы ня могуць разьбірацца ў самых элемэнтарных пытаньнях праграмы і статуту і важнейшых рашэньнях партыі. Гэта ўсё гаворыць аб зусім слабай рабоце парткалектыву па марксысцка-ленінскаму выхаваньню партыйцаў.

Асобна неабходна застанавіцца на становішчы самакрытыкі і фактаў сямейнасьці і кругавой парукі на заводзе «Бальшавік». Увесь ход чысткі паказаў, што бальшавіцкай самакрытыкі на заводзе па сутнасьці справы ня было. Некаторая частка актыву станавілася на абарону крытыкуемых таварышоў.

Меў месца такі факт. Калі адзін (падкрэсьліваем: толькі адзін) таварыш выступіў з крытыкай дырэктара тав. Бандарчыка, ён быў спатканы, як кажуць, «у штыкі». Тав. Бандарчык пачаў кідаць пагрозы на адрасу праверкому. У гэтым антыпартыйным выпадзе тав. Бандарчык адбіў настроі нездавальненьня чысткай з боку клясава-варожых элемэнтаў, нездавальненьне рашучай лініяй праверкому на разгортваньне самакрытыкі «ня гледзячы на асобы».

Толькі адсутнасьцю крытыкі і самакрытыкі, сямейнасьцю, кругавой парукай можна тлумачыць той факт, што не прыцягваліся да адказнасьці вінаватыя, якія дапусьцілі падвышэньне сабекаштоўнасьці на 193 тыс. руб.

Толькі гэтым можна тлумачыць, чаму была такая засьмечанасьць партарганізацыі клясава-чужым элемэнтам. Толькі ў абставінах заціску самакрытыкі мог здарыцца такі агідны факт, як дапушчэньне ў члены ЦВК СССР рабочага гэтага заводу Шымчанкі, які быў у часе белапольскай акупацыі старшынёй польскага хрысьціянскага саюзу, які разлагаў рэвалюцыйны рух і пры дапамозе польскага камандваньня зрываў рыхтаваўшыяся забастоўкі рабочых.

І ўрэшце, толькі па гэтых-жа прычынах заціску самакрытыкі і праявах сямейнасьці, кругавой парукі, змагло здарыцца тое, што пры намаганьні героя 1-й пяцігодкі быў абмінуты рад рабочых, сапраўдных герояў пяцігодкі і замест іх высоўваліся гандляры, клясава-варожыя элемэнты (Фрыдляндзі і інш.), контр-рэвалюцыянэры, трацкісты («Ударнік» Змудзек, Драгілеў і інш.).

Чыстка партыйнага калектыву заводу «Бальшавік» закончылася. Яна праходзіла пры выключна нябывалай, нябачнай дагэтуль на заводзе актыўнасьці ўсяго парткалектыву і рабочых мас. Яна ачысьціла партарганізацыю заводу ад клясава-чужых, антыпартыйных элемэнтаў. Яна ўзмацніла баяздольнасьць партарганізацыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі.

Ня можа быць ніякіх сумненьняў у тым, што партарганізацыя заводу «Бальшавік» рашуча выправіць выяўленыя камісіяй сур'ёзныя недахопы і апраўдае сваё званьне партарганізацыі Чырвонасьцяжнага заводу.

М. З.

Аўтапробег Масква—Карла-Маркс Масква.

На здымку: Машыны прыбылі ў Горкаўскі край.

Пра будаўніцтва дому Чырвонай арміі ў г. Менску

Пастанова СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе: лічыць неабходным отвараньне грамадзкай камісіі садзейнасьці будаўніцтву цэнтральнага дому Чырвонай арміі ў г. Менску ў складзе т. т. **Галадзеда** (старшыня камісіі), **Гікало, Аранштама, Цімашэнка, Каранеўскага.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік справаў Савету Народных Камісараў БССР С. КАДЫБОВІЧ.

Лепшай раённай газэце--пераходны сьцяг

Цэнтральная конкурсная камісія па правядзеньні ўсесаюзнага конкурсу друку па фінансах дала растлумачэньне аб парадку перасуджэньня пераходнага чырвонага сьцягу цэнтральнай конкурснай камісіі, які па конкурсе друку быў прысуджан раённай газэце «КАМУНАР ЗАСЛАЎШЧЫНЫ».

У далейшым ГЭТЫ СЬЦЯГ БУДЗЕ ПЕРАСУДЖВАЦЦА КОЖНЫ КВАРТАЛ І ПЕРАДАВАЦЦА ТЭЙ РАЁННАЯ ГАЗЭЦЕ БССР, ЯКАЯ СВАЁЙ УДАРНАЙ РАБОТАЙ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НАЙЛЕПШЫЯ СЯРОД УСІХ РАЁНАЎ БССР ПАКАЗАЛЬНІКІ ВЫКАНАНЬНЯ КВАРТАЛЬНАГА ПЛЯНУ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА І АГРАМАДЖАНАГА СЭКТАРУ.

Перадача будзе адбывацца ў пачатку кожнага новага кварталу па выніках мінулага кварталу. Перасуджэньне сьцягу будзе рабіцца НАРКАМФІНАМ сумесна з рэдакцыямі газэт «ЗЬВЯЗДА» і «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ» і ЦП ФІНБАНКАЎСКІХ РАБОТНІКАЎ БССР.

РАЁННАЯ ГАЗЭТА, ЯКОЙ ПРЫСУДЖАЕЦЦА СЬЦЯГ АДНАЧАСОВА АТРЫМЛІВАЕ І ГРАШОВУЮ ЎЗНАГАРОДУ Ў СУМЕ 1.500 РУБ.

Чорная дошка

За ганебныя тэмпы дарожнага будаўніцтва заносім на чорную дошку наступныя раёны:

ЧАЧЭРСКІ — выканаўшы плян працудзелу насельніцтва на 7,2 проц., ВЕТКАЎСКІ — 8,4 проц., СІРОЦІНСКІ — 11,6 проц., ШКЛОЎСКІ — 13,1 проц., МАЗЫРСКІ — 13,1 проц., РЭЧЫЦКІ — 15,8 проц., ЕЛЬСКІ — 17,1 проц., УВАРАВІЦКІ — 17,3 проц., ЧЭРЫКАЎСКІ — 17,5 проц., ГОМЕЛЬСКІ — 20,2 проц., ГОРАЦКІ — 21,4 проц., ЦЕРАХАЎСКІ — 21,7 проц., НАРАЎЛЯНСКІ — 22 проц., ЛЕПЕЛЬСКІ — 24,1 проц., КРЫЧАЎСКІ — 24,1 проц., ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ — 24,2 проц.

Бліжэйшая задача раённых арганізацый забясьпечыць у бліжэйшыя дні ўздым работы па дарожным будаўніцтве з тым, каб нагнаць прапушчанае і да першага жніўня поўнасьцю выканаць плян дарожных работ.

Фэлікс Дзяржынскі

(Да сямігодзьдзя з дня сьмерці)

Сем год прайшло з дня сьмерці палкага і бясстрашнага байца старой бальшавіцкай гвардыі—Фэлікса Дзяржынскага. Ён памёр на 49-м годзе жыцьця на баявым посту.

У Фэліксе Дзяржынскім надзвычай ярка спаяліся ўсе якасьці бальшавіка: самаахвярная адданасьць барацьбе за рэвалюцыю, за сацыялізм, ідэйнасьць, непрымірымасьць да апартуністаў, бязьлітаснасьць да ворагаў.

«Буржуазія ня ведала больш ненавіснага імя, чым імя Дзяржынскага, які адбіваў сталёвай рукой удары ворагаў пралетарскай рэвалюцыі. Гроза буржуазіі — вось чым быў Фэлікс Дзяржынскі» (Сталін). Яго імя выклікала ў клясавых ворагаў страх і нянавісьць. Тым большай любасьцю і гарачым давер'ем мільённых мас працоўных акружана імя жалезнага Фэлікса, бо з гэтым імем зьвязаны слаўныя і незабыўныя старонкі вялізарнейшай у гісторыі чалавецтва рэвалюцыі.

У 1898 годзе в першай сваёй ссылкі Дзяржынскі пісаў сястры: «Умовы жыцьця далі мне такі напрамак што плынь, якая мяне захапіла, для таго толькі выкінула мяне на некаторы час на бязьлюдны бераг, каб потым з новай сілай захапіць мяне і несьці з сабой усё далей і далей пакуль я даканца не знайшуся ў барацьбе, г. зн. працэлам маёй барацьбы можа быць толькі магіла».

Рэвалюцыйная плынь, якая яго захапіла яшчэ ў 1895 г. (ён быў тады 18-гадовым юнаком), была тэй стыхіяй, па-за якой ён сабе жыцьця не ўяўляў. «Калі-б зорка сацыялізму, зорка будучага сапраўды не сьвяціла чалавецтву, ня варта было-б жыць»— пісаў Фэлікс у сваім дзеньніку.

І ўсё сваё сьвядомае жыцьцё Фэлікс аддаў барацьбе за сацыялізм. Яшчэ будучы юнаком, Дзяржынскі мог разглядзець трывавыя сьлады царскага атрыбчыка Мураўёва-вешальніка, які з надзвычайнай і нячуванай жорсткасьцю задушаў паўстаньні ў Польшчы і Беларусі ў 1863 годзе. Пачынаючы з 1895 г., Юзэф (рэвалюцыйная клічка Дзяржынскага) пачаў калясіць па Польшчы, зьяўляючыся ўсюды, дзе змагаўся польскі рабочы: у гарнякоў Дамброўскага вугольнага басэйну, у лодзінскіх ткачоў, варшаўскіх мэталістаў. Усюды, дзе ён зьяўляўся, ён, як арганізатар, масавік і прапагандыст, натхняў да барацьбы з ворагам, да барацьбы бязьлітаснай і бясстрашнай.

Яго падпольная работа чаргавалася з турмой, ссылкай і ўцёкамі. Ён быў бліжэйшым прыяцелем Розы Люксэмбург і Ёгіхэса-Тышко—правадыроў польскай сацыял-дэмакратыі, потым сам высунуўся ў рады рэвалюцыйных правадыроў і быў выбран членам ЦК РСДРП(б).

У разгары бабу 1917 году ён пісаў: «Я знаходжуся ў самым агні барацьбы. Жыцьцё салдата, у якога няма адпачынку, бо трэба ратаваць палаючы дом. Няма калі думаць пра сваіх і пра сябе. Работа і барацьба шалёная. Але сэрца маё ў гэтай барацьбе застаўся жывым, тым-жа самым, якім было і раней. Увесь мой час, гэта — адно бесьперапыннае дзеяньне, каб устаць на пасту да канца». І далей ён піша: «Я высунут на пост перадавой лініі агню, і мая воля: змагацца і глядзець адкрытымі вачыма на ўсю небясьпеку грознага становішча і самому быць бязьлітасным, каб, як верны вартавы пёс, разарваць ворага».

Такім быў Фэлікс заўсёды. Калі ён быў назначан старшынёю ВЧК, калі партыя ўручыла яму ў рукі караючы меч рэвалюцыі, ён наносіў сакрушальныя ўдары па ўсіх тых, хто прабаваў пасягнуць на савецкую дзяржаву. Ён бязьлітасна разрываў ушчэнт сетку контр-рэвалюцыйных змоваў, ня гледзячы на ўсе стараньні чужаземных імпэрыялістаў, расійскай белагвардзеі шчыны і сацыял - інтэрвэнтаў.

Бязьлітаснасьць Дзяржынскага адна вадала бязьлітаснасьці грамадзянскай вайны, вайны, якую вёў перамогны пралетарыят супроць нападаючых ворагаў. «Мы заўсёды ведалі,—пісаў Ленін,— гаварылі, паўтаралі, што сацыялізму нельга «ўвесьці», што ён вырастае ў ходзе самай напружанай, самай вострай да шаленства, да роспачы вострай клясавай барацьбы і грамадзянскай вайны,—што паміж капіталізмам і сацыялізмам ляжыць доўгі пэрыяд «родавых мук», што гвалт заўсёды бывае павітальнай бабкай старога грамадзтва».

Калі грамадзянская вайна падыходзіла да канца, партыя паставіла Фэлікса Дзяржынскага на пост Наркамшляху, аставіўшы яго кіраўніком ВЧК-ДПУ. Транспарт—важнейшы вузел народнай гаспадаркі—быў вельмі разбураны. Інтарэс пралетарскай дзяржавы настойліва патрабаваў адпаўленьня транспарту. Дзяржынскі ўнёс у работу на транспарце сваю кіпучую энэргію, цьвёрдасьць і рашучасьць, уменьне арганізаваць людзей і ламаць супраціўленьне клясавага ворага.

У 1924 годзе, калі на аснове новага разгарнулася сацыялістычнае наступленьне, партыя ставіць Фэлікса Дзяржынскага на чале ВСНГ. Ён і тут разгортвае вялізарную работу, па-бальшавіцку змагаючыся за паскарэньне тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі. «СССР павінен стаць мэталёвым»—так сфармуляваў Дзяржынскі палітыку партыі ў галіне прамысловасьці.

Фэлікс Дзяржынскі патрабаваў ад гаспадарнікаў непарыўнай сувязі з партыяй, з масамі. «Калі гаспадарнік,—гаварыў ён, —ня ведае масы, ня ўмее стаць яе правадыром, ня здолеў завязаць з ёю пастаянных жывых сувязяй, то ён ня можа быць ні добрым членам партыі, ні добрым гаспадарнікам».

Дзяржынскі выхаваў цэлую плеяду гаспадарнікаў-бальшавікоў, якія цяпер праводзяць далей тую гігантыкую работу па індустрыялізацыі краіны, якую пачаў ён сам у 1924 г.

Пад кіраўніцтвам партыі Фэлікса Дзяржынскі прабіў шлях да вялікай будоўлі сацыялістычных гігантаў. Магнітагорск, Кузьнецк, Днепрадзэс, Сталінградзкі трактарны, Чалябінскі трактарны, Уралмаш, Нізкагародзкі аўтамабільны, Маскоўскі аўтамабільны і рад іншых гігантаў вырасьлі на тэй экспамічнай базе, за стварэньне якой нястомна і самааддана змагаўся Фэлікс Дзяржынскі—вялікі ўдарнік бальшавіцкай партыі.

«Наша партыя ў асобе тав. Дзяржынскага траціць аднаго з самых выдатных, з самых гераічных сваіх правадыроў»—гаварыла адозва ЦК УсеКП(б) у дзень яго сьмерці.

Нікай вобраз гэтага гераічнага правадыра, сталёвага чакіста-бальшавіка будзе прыкладам для соцень тысяч маладых бальшавікоў, якія змагаюцца за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва!

„Першая запаведзь—выкананьне пляну збожжазагатовак" (СТАЛІН)

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ПЕРШАГА ЖНІЎНЯ УСЕБЕЛАРУСКАГА ЧЫРВОНАГА АБОЗУ СА ЗБОЖЖАМ НОВАГА УРАДЖАЮ

Бюракратычны спакой і мядзьвежая няспрытнасьць

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Бабруйская міжраённая кантора Загатзбожжа павінна абслужыць 6 раёнаў. Адсюль зразумела, якая вялікая адказнасьць прыпадае на кантору, якія вялікія задачы стаяць перад ёй па арганізацыі хуткай, бесьперабойнай прыёмкі збожжа і сена.

Трэба са ўсёй рашучасьцю сказаць, што Бабруйская кантора не падрыхтавалася да прыёмкі прадукцыі, яна не адчувае ўсёй адказнасьці, якая ўскладзена на яе.

Запытайцеся ў загадчыка канторы тав. **Ліакумовіча:**

— Колькі збожжа могуць умясьціць вашы склады? Ён вам адкажа, што склады могуць зьмясьціць толькі 3.800 тон. Такім чынам наяўная колькасьць складаў ня можа прыняць прадукцыі нават аднаго Бабруйскага раёна, не гаворачы ўжо аб завозе збожжа з іншых раёнаў.

Мала гэтага. З 12 складаў 4 заняты пад ячмень леташняга ўраджаю. Заняты яны, вядома, ня поўнасьцю, а так процантаў на 5-10. Але гэтым карыстаецца т. Ліакумовіч, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць у рамонце і дэзінфэкцыі складаў: «бачыце, няма памяшканьняў для рамонту».

Чаму нельга ўвесь ячмень зьвезьці ў адзін склад, а ў іншых зрабіць рамонт? Над гэтым Загатзбожжа не задумвалася.

Наогул Ліакумовіч вельмі спакойны, ён упэўнена заяўляе, што «ў бліжэйшыя дні сёе-тое будзе зроблена». Гэты бюракратычны спакой вельмі небясьпечны, ён стварае яўную падрозу бесьперабойнай прыёмцы прадукцыі в першых дзён пачатку цьвёрдых паставак.

Ліакумовіч ня можа ўпэўнена сказаць — колькі памяшканьняў будзе мець Загатзбожжа для прыёмкі прадукцыі. Між тым, здача збожжа пачнецца ў бліжэйшыя тыдні.

Паводле даных канторы, яна мае 30.000 мяшкоў — «тары хоць адбаўляй». Мне давялося бачыць гэтыя мяшкі — вялікая частка іх дзіравыя, ні адзін мех не прадызэфэктаваны. Ліакумовіч і тут знаходзіць «аб'ектыўныя прычыны». Аказваецца, дызэфэкцыйная камэра ня прыяжджала, вось у чым справа»...

Трэба таксама адзначыць поўную адсутнасьць пляну арганізацыі прыёмкі збожжа ад здатчыкаў. Адзінае, што змагла кантора зрабіць, гэта прымацаваць 21 сельсавет да аднаго складу. Можна загадзя ўявіць, які хаос, якая блытаніна будзе, калі з 21 сельсавету зьбярэцца ўсе фурманкі да аднаго складу. Калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры да арганізацыі прыёмкі, дык у часе паставак створацца вялікія чаторы фурманак каля прыёмачнага пункту і сялянам прыдзецца суткамі чакаць, пакуль прымуць прадукцыю.

— Толькі-б прывезьлі, а мы ўжо як-небудзь прымем, — вось довад, якім апэруюць апартуністы з канторы Загатзбожжа. Яны мала клапоцяцца аб лепшым абслугоўваньні здатчыкаў. Загатоўчыя арганізацыі, як мы бачым, не перабудавалі сваёй работы, працуюць старымі, асуджанымі тэмпамі.

Дагэтуль нічога ня зроблена, каб рамантаваць пад'язныя шляхі. Ліакумовіч сьцьвярджае адно: яму на гэту справу адпусьцілі дзьве тысячы рублёў, а патрабуецца 4 тысячы. Пакуль ня будзе атрымана датацыя, рамонт дарог рабіцца ня будзе. Такое-ж становішча з арганізацыяй культабслугоўваньня здатчыкаў. «Грошы няма, значыць і рабіць нічога ня будзем. Нейкая чайная на рынку ёсьць, ну і добра».

Загадчык агітмасавага сэктару райкому тав. **Рэйзін** абмежаваўся тым, што выпісаў 50 лёзунгаў па фускай мове і перадаў іх канторы Загатзбожжа для «мастацкага афармленьня». Работнікі Загатзбожжа зараз заняты перакладам лёзунгаў Рэйзіна. А якасьць іх даволі сумніцельная. Што можна зразумець, напрыклад, з такой фразы:

«Конной урожай на третий день косовицы»?

Поўную адказнасьць за непадрыхтаванасьць Бабруйскай міжраённай канторы Загатзбожжа нясуць і раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі. Яны шавіны ўмяшацца ў гэту справу і прымусіць загатоўчыя арганізацыі па-баявому ўзяцца за падрыхтоўку. Пачатак цьвёрдых паставак трэба сустрэць у баявой гатоўнасьці.

П. Чыкун.

24 ліпеня пачынаем уборку збожжа

17 ліпеня пачалася вытворчая нарада пры палітаддзеле Цялускай МТС, на якой было абмеркавана пытаньне канкрэтнай арганізацыі ўборачных работ, арганізацыі здачы прадукцыі дзяржаве. На гэтай-жа нарадзе было абмеркавана пытаньне аб правядзеньні міжнароднага чырвонага дня 1-га жніўня.

У радзе калгасаў 24 ліпеня пачынаецца ўборка жыта і ячменю. Перадавыя калгасы пастанавілі падтрымаць ініцыятыву дэлегацыі Шнілоўскага р-ну на ўсебеларускім зьезьдзе 1 сустрэць 1-га жніўня арганізацыяй чырвоных абозаў па здачы дзяржаве новага ўраджаю. Для дапамогі і арганізацыі гэтай справы ў калгасы выехалі ўсе работнікі палітаддзелу МТС і парт'ячэйкі МТС.

АБ ВЫНІКАХ ПЕРШАГА ЭТАПУ УСЕСАЮЗНАГА І УСЕБЕЛАРУСКАГА КОНКУРСУ НА ЛЕПШЫ ПА РАБОЦЕ СЕЛЬСКІ САВЕТ ПА-ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ І АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПРАПОЛАЧНАЙ І УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ І КАМПАНІІ ПА ЗДАЧЫ С.-Г. ПРАДУКТАЎ ДЗЯРЖАВЕ

Пастанова прэзыдыуму ЦВК Беларускай ССР

Заслухаўшы даклады ўпаўнаважаных Наркамсаўгасу Саюзу ССР, Белкаапсаюзу, Рагачоўскага, Касьцюковіцкага і Мсьціслаўскага райвыканкомаў, Ціхініцкага сельсавету і саўгасу Ціхінічы, Рагачоўскага раёну, калгасу імя Чарвякова, Мсьціслаўскага раёну, аб іх рабоце ў галіне правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі і падрыхтоўцы да прапалачнай і ўборачнай кампаніі і кампаніі па здачы с.-г. прадуктаў дзяржаве, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае:

а) Мсьціслаўскі РВК прае свайго прадстаўніка тав. Дамброўскага на пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК 26 сакавіка 1933 г. заявіў, што раён падрыхтаваў да веснавой пасеўнай кампаніі, што РВК абазьвяваецца разгарнуць шырокую масавую работу на правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі, няправільна асьвятлёўшы сапраўднае становішча ў раёне, бо падрыхтоўка да веснавой пасеўкампаніі была праведзена нездавальняюча. Конскае пагалоўе аказалася на многіх сельсаветах і калгасах раёну непадрыхтаваным, не забясьпечаным фуражом на час веснавых работ. Складаньне вытворчых плянаў, арганізацыя брыгад былі праведзены зусім нездавальняюча. Машына - трактарны парк аказаўся зусім непадрыхтаваным да пасеўкампаніі.

Ня гледзячы на заўнасьць гэтых прарываў, сваячасовае указаньне на іх з боку прэзыдыуму ЦВК і іншых органаў, Мсьціслаўскі раённы выканаўчы камітэт не скарыстаў гэтых указаньняў для таго, каб перабудаваць работу саветаў. Раён фактычна ня ўключыўся ва ўсебеларускі і ўсесаюзны конкурс на лепшы сельсавет, не разгарнуў работы саветаў на ліквідацыю адзначаных прарываў, на мабілізацыю мас і сапраўдную бальшавіцкую барацьбу за выкананьне плянаў веснавой сяўбы, у выніку чаго Мсьціслаўскі раён ідзе ўнесь час з вялізарнейшымі прарывамі і занесен за гэта на чорную дошку. Асноўнай прычынай гэтага зьяўляецца некаркрэтнае, славесна-дэкларацыйнае кіраўніцтва і палескія адносіны з боку РВК і іншых раённых арганізацый да пасеўнай кампаніі, у выніку чаго сяўба праходзіць яўна нездавальняюча. Між іншым, у раёне ёсьць цэлы шэраг аказалічасьцяй, скарыстаньне якіх павінна было-б паставіць раён у шэраг перадавых. Прыкладам гэтаму можа служыць калгас імя Чарвякова, Несьцярава і інш.

б) Касьцюковіцкі РВК не скарыстаў конкурсу на лепшы па рабоце сельскі савет у першым яго этапе — веснавой пасеўнай кампаніі, не папулярызаваў яго як сьлед сярод савецкага актыву і шырокіх працоўных мас, не зразумеў вялікага значэньня конкурсу, як важнейшай формы масавай барацьбы на мабілізацыі вясковага актыву і разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва вакол паспяховага выкананьня важнейшых задач партыі і савецкай улады — веснавой сяўбы. У Касьцюковіцкім раёне з 38-мі сельсаветаў уключылася фармальна ў конкурс 17 сельсаветаў і толькі 4 сельсаветы фактычна разгарнулі работу па конкурсу;

в) невыстарчальная ўвага да арганізацыйна-масавай работы з боку Касьцюковіцкага і асабліва з боку Мсьціслаўскага РВК вызьвілася адной з галоўных прычын невыкананьня ў тэрмін сяўбы (Касьцюковіцкі раён выканаў плян сяўбы на 5-VI на 93,2 проц., Мсьціслаўскі раён — толькі на 75,3 проц.). Па гэтых раёнах яшчэ да гэтага часу не разгорнута работа на праполцы і падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі;

г) Рагачоўскі раён дабіўся посьпехаў у мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас у выкананьні пляну веснавой пасеўнай кампаніі, выканаўшы плян веснавой сяўбы да 25 мая на 100,3 проц., прычым Ціхініцкі сельскі савет скончыў сяўбу 17 мая.

Аднак, агульная арганізацыйна-масавая работа ў раёне ня была лічыльна вызвана з вырашэньнем задач па арганізацыйна-гаспадарчым і палітычным умацаваньні калгасаў, па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, па ўцягненьні бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, у выніку чаго калгасны сэктар у раёне складае толькі 24 проц.;

д) Упаўнаркамсаўгасаў зусім ня ўключыўся ў конкурс на лепшы па рабоце сельскі савет, не зразумеў усёй яго важнасьці для пасьпяховага выкананьня пляну сяўбы ў саўгасах, пры яўным адставаньні саўгасаў у справе выкананьня пляну веснавой пасеўнай кампаніі.

Выходячы з вышэй адзначанага, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Паставіць на від прэзыдыуму РВК Мсьціслаўскага раёну за тое, што ён, вграбіўны даклад і заяву на пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК 26 сакавіка 1933 г. у асобе свайго ўпаўнаважанага тав. Дамброўскага аб гатоўнасьці да сяўбы і аб ліквідацыі наяўных недахопаў, ня выканаў сваёй заявы. Абвясьціць загадчыку земчасткі т. Дамброўскаму суровую вымову за няправільную інфармацыю аб становішчы падрыхтоўкі да сяўбы ў раёне.

Прапанаваць старшыні Мсьціслаўскага РВК тав. Марону перабудаваць работу РВК і прыняць усе меры для таго, каб вывесьці раён з паласы глыбокага прарыву, у якім ён апынуўся.

2. Прапанаваць усім РВК неадкладна арганізаваць уключэньне сельсаветаў у сацспаборніцтва, разгарнуць работу па ажыцьцяўленьні дырэктывы партыі і ўраду па праполцы і ўборцы ўраджаю і здачы с.-г. прадуктаў сваячасова і поўнасьцю, вядома, у першую чаргу на аснове арганізацыі шырокай масава-растлумачальнай работы сярод рабочых саўгасаў, калгаснікаў, беднякоў-сераднякоў, аднаасобнікаў і асабліва сярод жанчын; узьняць актыўнасьць масавых зьвеньняў саветаў і сэкцый, дэпутацкіх груп і інш.

3. Абавязаць Наркамзем і Упаўнаркамсаўгасаў неадкладна праверыць выкананьне пляну завозу сельска-гаспадарчых уборачных машын і забясьпячэньне імі саўгасаў і калгасаў, ужыўшы ўсе захады да сваячасовай адпраўкі ўборачных машын у саўгасы і калгасы.

Абавязаць усе РВК і гарсаветы арганізаваць праз сэкцыі і дэпутацкія групы саветаў праверку становішча ўборачных машын, іх сваячасовы рамонт і правільнае скарыстаньне ў часе ўборкі.

4. Абавязаць Упаўнаркамсаўгасаў даць канкрэтныя ўказаньні сваёй сыстэме аб практычным удзеле ў конкурсе, мабілізаваўшы ўвагу рабочых саўгасаў на паспяховае правядзеньне конкурсу, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну сяўбы па саўгасах, пераключыўшы іх на праполку і ўборку і г. д. у сыстэме саўгасаў.

5. Прапанаваць Рагачоўскаму райвыканкому звярнуць асаблівую ўвагу ва ўсёй дзейнасьці на справе арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацаваньня калгасаў, мабілізуючы шырокія працоўныя масы на барацьбу з клясавым ворагам, рашуча вычышчаючы з калгасаў кулакоў, антысавецкі элемэнт, лодыраў, цвачоў і г. д. і забясьпечыўшы штодзённае кіраўніцтва справай прыёму бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў у калгасы.

Абавязаць Касьцюковіцкі і Мсьціслаўскі РВК неадкладна арганізаваць шырокую папулярызацыю конкурсу на лепшы па рабоце сельскі савет, абгаварэньне сельсаветамі вынікаў першага этапу ўсесаюзнага конкурсу, уключэньне ўсіх астатніх сельсаветаў у конкурс, забясьпечыўшы канкрэтнае ажыцьцяўленьне ўмоў конкурсу ва ўсіх сельсаветах, аказваючы ім усямерную дапамогу ў разгортваньні конкурсу і забясьпечыць сыст

ПА КРЫВАВАМУ СЬЛЕДУ

У Катавіцах (Польшча) створана новая фашысцкая арганізацыя, якая цалкам адлюстроўвае праграму нямецкіх фашыстаў. Называецца яна Нацыянал-сацыялістычная рабочая партыя. (НОРП).

(«Роботнік»).

У КРАІНЕ ДЗІКАГА ТЭРОРУ

АХВЯРЫ ФАШЫСЦКІХ БАНДЫТАЎ

ЛЁНДАН, 19. (ТАСС). Згодна паведамленьня «Дэйлі Геральд» у Баварскім канцлягеры Дахау з часу яго арганізацыі ў красавіку нацыянал-сацыялістамі забіт 141 палітычны, быц цам «пры спробе ўцачы». Калі сем'ям забітых дазвалялася ўзяць трупы для пахаваньня, начальнік канцлягеру перадаваў іх у запячатаных трунах, відавочна, з мэтай утаіць сьляды катаваньняў.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ РАБОЧЫХ У ГЕРМАНІІ

БЭРЛІН, 18. (БЕЛТА). У МЮНСТЭРЫ арыштаваны 22 актыўных работнікі кампартыі па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да Саюзу чырвоных франтавікоў. У ВІТЭНБЭРГУ арыштаван рабочы Хэйль, які ў часе выступленьня Гітлера ў Галле перарэзаў провад радыёўстаноўкі. У ГРЭЙФСВАЛЬДЗЕ арыштавана 6 камуністаў па абвінавачаньні ў стварэньні новай падпольнай камуністычнай арганізацыі.

У лягеры працпавіннасьці ГЕЛЬБРУ НЕ арыштаваны і накіраваны ў канцлягер 13 рабочых нібыта за спробу арганізаваць камячэйку ў лягеры працпавіннасьці.

Хваляваньні ўнутры нацыянал-сацыялісцкай партыі ўзмацняюцца

БЭРЛІН, 18. (БЕЛТА). Міністар прапаганды Гебэльс выступіў учора на радыё з прамоваю, якая сукоина пацьвярджае наяўнасьць узмоцненага хваляваньня ўнутры нацыянал-сацыялісцкай партыі і ўзрастаючага нездавальненьня радавых членаў нацыянал-сацыялісцкай партыі палітыкай ураду. Прамова Гебэльса, таксама як і апошняя прамова Гітлера, была накіравана супроць так званай «другой рэвалюцыі» і «некампетэнтнага ўмяшаньня ў гаспадарчыя справы». Паводле слоў Гебэльса, ўрад пільна сочыць за тымі скрытымі элемэнтамі ўнутры нацыянал-сацыялісцкай партыі, якія гавораць аб «другой рэвалюцыі».

Бунт сярод штурмавых атрадаў

ЛЁНДАН, 18. (БЕЛТА). «Дэйлі Геральд» паведамляе, што ў Гамбургскім раёне сярод штурмавых атрадаў выбухнуў бунт. Штурмавікі патрабавалі палепшэньня свайго становішча, указваючы пры гэтым на высокія аклады, якія атрымоўваюць вышэйшыя нацыянал-сацыялісцкія чыноўнікі. Кіраўніку гамбургскіх нацыянал-сацыялістаў, які зьяўляецца адначасова і намесьнікам Гамбургу, Кауфману толькі з вялікімі цяжкасьцямі ўдалося прыдушыць гэты бунт. Як паведамляюць газэты ў рэзультаце бунта з гамбургскіх штурмавых атрадаў выключана 12 тысяч чалавек. Апрача таго некалькі сот штурмавікоў арыштаваны і будуць перададзены суду у сакрэтным парадку.

ПА ПРЫКЛАДУ ГЕРМАНСКІХ ФАШЫСТАЎ

ВАРШАВА, 19. (ТАСС). «Ілюстраваны кур'ер цодзённы» пад загалоўкам «Савецкая Расія афіцыяльна прызнае банкрутства сваёй сельскай гаспадаркі» друкуе вядомую фальшыўку, якая зьявілася ў германскай фашысцкай прэсе.

Паведамленьне газэты пачынаецца таксама, як паведамленьне «Тэль Уніён». Рэдакцыя газэты зрабіла заведамы падлог, зьмяшчаючы ўжо выкрытую фальшыўку «Тэль Уніён» у якасьці паведамленьня свайго «ўласнага карэспандэнта з Масквы». Гэты падлог паказвае, што нават самыя салідныя органы польскай фашысцкай прэсы не пагарджаюць ніякімі сродкамі для апрацоўкі грамадзкай думкі ў антысавецкім духу.

Нацягнутыя адносіны паміж ПАЗШ і Гішпаніяй

ВАШЫНГТОН, 18. (БЕЛТА). Паміж ПАЗШ і Гішпаніяй стварыліся нацягнутыя адносіны. Прычына—арышт 6 амэрыканскіх турыстаў пасьля сутычкі ў кафэ ў Пальма, на востраве Маёрка. Турыстаў абвінавачваюць у нападзе на ваенную паліцыю. Яны пад арыштам ужо 42 дні. Ня гледзячы на паўтарэньне дыпляматычнага пратэставаньня, гішпанскія грамадзянскія ўлады адмаўляюцца ад умяшаньня ў гэту справу, спасылаючыся на тое, што яна падсудна толькі ваеннаму суду. Міністар ваенных спраў запрасіў гішпанскага пасланьніка для перагавораў.

Прэміі за зьнішчэньне пасеваў у ПАЗШ

Н'Ю-ЁРК, 18. (БЕЛТА). Урад абвясьціў аб сваім пляне разьмеркаваць сярод тутэйшаводаў прэміі на 3.500 тысяч даляраў за частковае зьнішчэньне цяперашніх пасеваў і скарачэньне да разьмераў паловы леташніх пасеваў. Прэміяльны фонд будзе створан з паступленьня ад спэцыяльнага падатку, які ўстанаўляецца для гэтай мэты на фабрычную перапрацоўку гутуну. Фэр мэры, якія заўсёды зыходзяць з неабходнасьці здабываць ня могуць зразумець гэтай палітыкі разбурэньня.

Н'Ю-ЁРК, 18. (БЕЛТА). Цэны на пшаніцу раптоўна рэзка ўпалі. Зьявіліся паведамленьні, што Аргэнтына пастаўляе ў ПАЗШ пшаніцу па цэнах, ні жэйшых чым пашыча-амэрыканскія. Міністар сельскай гаспадаркі Уолс перасьцярагае фэрмы, што павышэньне цэн ня можа вырашыць пшанічнай праблемы, калі яны не скарацяць пасеўнай плошчы. Пры гэтым ён падкрэсьліў, што ў ПАЗШ захаваліся вялікія запасы пшаніцы ад ураджаю мінулага году.

Тав. Радэк варочаецца ў Маскву

ВАРШАВА, 18 (Белта). Паўнамоцны прадстаўнік СССР тав. Антонаў-Аўсеенка паладзіў разьвітальнае сьнеданьне ў гонар тав. Радэка, які варочаецца ў Маскву. Прысутнічалі нач. ўсходняга аддзелу міністэрства замежных спраў Шэтцэль, галоўны рэдактар «Газэты Польскай» Медзінскі і былы міністар Матушэўскі.

Германскі друк аб прабываньні Гэндэрсона ў Бэрліне

БЭРЛІН, 17. (БЕЛТА). Старшыня канфэрэнцыі па разазбраеньні Гэндэрсон сёньня раніцою прыбыў у Бэрлін. Пасьля абеду адбылася сустрэча Гэндэрсона з германскім міністрам замежных спраў Нэйратам, ваенным міністрам Блямбэргам і кіраўніком германскай дэлегацыі на жэнэўскай канфэрэнцыі Надольным.

Тон каментарыяў германскага друку ў сувязі з прыездам Гэндэрсона не пакідае сумненьня ў тым, што бэрлінская паездка Гэндэрсона не прынясе якіх небудзь адчувальных рэзультатаў. «Гэндэрсону добра вядома, — піша нацыянал-сацыялісцкі «Антрыф»,— што Германія ўсё яшчэ чакае выкананьня даных ёй абяцаньняў адносна раўнапраўя ва ўзбраеньнях. Трэба спадзявацца, што старшыня канфэрэнцыі па разазбраеньні, які адначасова зьяўляецца правадыром другога інтэрнацыяналу, зможа ў часе свайго візыту ў Бэрлін больш поўна азнаёміцца з пазыцыяй Германіі ў гэтым пытаньні».

«Дойчэ дылпляматышэ карэспандэнц» з прычыны візыту Гендэрсона зноў паўтарае сваю вэрсію, быццам усе спробы дабіцца згоды ў справе разазбраеньня натыкаюцца на супраціўленьне Францыі.

Замежная хроніка

* Праўленьне «Амэрыкана-Расійскай гандлёвай палаты» прыняло пастанову на карысьць прадастаўленьня крэдытаў СССР. У склад праўленьня ўваходзяць прадстаўнікі буйнейшых электратэхнічных, паравоза-будаўнічых, аўтамабільных і авіяцыйных, нафтавых, машына-будаўнічых і іншых фірм.

* Сёньня ў Осака (Японія) арыштаваны відныя дзеячы фашысцкай партыі «Дай Нікон Сейсанто», Токуда і Енамото па абвінавачаньні ва ўдзеле ў змове, раскрытай 11-га ліпеня г. г.

22 ліпеня а 7-ай гадзіне ўвечары рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА" **склікае**

пашыраную нараду

па пытаньні

аб ходзе выданьня стабільных падручнікаў для школ.

На нараду запрашаюцца: прадстаўнікі НКА, вучпэдсэктару і нац. сэктару ДВБ, друкарні Імя Сталіна, Паліграфтрэсту, Акадэміі Навук, НДІ Комвыхаваньня, ЦП працасьветы, ЦП саюзу друкароў, ЦП прац. мастацтва, сэктару кнігараспаўсюджаньня, гарана і жадаючыя настаўнікі, асьветнікі, рабочыя друкарні.

РЭДАКЦЫЯ.

27 ліпеня ўсебеларускі зьлёт ударнікаў сплаву

Ліквідаваць разрыў паміж пускам лесу ў сплаў і дастаўкай яго на месца прызначэньня

Той факт, што Белсплаўканторам да 1-га ліпеня выканала каляндарны плян па пуску ў сплаў драўніны (пушчана 68 проц. сэзоннага плану), яшчэ не гаворыць аб тым, што сплаўныя работы на ракох БССР праходзяць належнымі тэмпамі. Адна справа пусьціць лес па ваду, а другая — даставіць яго на месца прызначэньня.

Вось з гэтай-та задачай Белсплаўканторам і яе філіялы зьвесьні справляюцца нездавальняюча. На 10 ліпеня прыбыла на канечныя пункты толькі 42 проц. усёй пушчанай сплаў драўніны. Прырост за дэкаду складае ўсяго 8 проц.

Такім чынам, разрыў паміж пускам драўніны ў сплаў і дастаўкай яе на канечныя пункты вельмі вялікі. Ён зусім не дапушчальны. Перад сплаўнымі арганізацыямі зараз стаіць задача: не ослабляючы тэмпаў па пуску лесу ў сплаў аддаць асаблівую ўвагу фарсаваньню дастаўкі яго на месца прызначэньня.

Усебеларускі зьлёт ударнікаў сплаву, які склікаецца ў Менску 27 ліпеня, павінен прайсьці пад знакам мабілізацыі ўвагі ўсіх плытагонаў на ажыцьцяўленьне гэтай задачы. Правз насылаць дэлегатаў на зьлёт прадастаўлена толькі тым калектывам і брыгадам, якія сапраўды па-ударнаму выконваюць свае заданьні на сплаву. Пры гэтым дэлегатамі абіраюцца лепшыя з лепшых ударнікаў сплаву.

Сабраўшыся на зьлёт яны абменяюцца вопытам сваёй ударнай работы, вызначаць мерапрыемствы, ажыцьцяўленьне якіх павінна забясьпечыць датэрміновае выкананьне сплаўной праграмы. Ці ёсьць у нас для гэтага магчымасьць? Бязумоўна ёсьць. Дастаткова толькі спыніць хаджэньне плытагонаў за 3-5 кілёмэтраў ад плыта ў вёску сьнедаць і абедаць — і час сьледваньня драўніны ў дарозе скараціцца амаль на палову. А такое зьявішча можна сустрэць на цэлым радзе вучасткаў. Пасадзіўшы плытагона на плыт, кіраўнікі сплаўвучасткаў лічаць, што з іх боку ўсё зроблена: лес будзе дастаўлен, а калі — для іх усяроўна. Не атрымаўшы неабходнай колькасьці прадуктаў на час сьледваньня ў дарозе, плытагон прымушан прычальваць да берагу і ісьці ў вёску абедаць.

Асабліва гэта назіраецца на вучастках Гомельскай сплаўканторы, якая зьяўляецца самай адсталай ва ўсёй сыстэме Белсплаўканторы. У той час, калі па ўсёй сыстэме да 1-га ліпеня было пушчана на ваду драўніны 68 проц. сэзоннай праграмы, то па Гомельскай канторы толькі 53 проц. Першая палова ліпеня таксама не дала належнага зруху.

Кіраўнікі канторы сваё адставаньне тлумачаць «аб'ектыўнымі» прычынамі.

— **У рэках шмат вады** — заяўляюць яны, — **многаводзьдзе перашкаджае нам працаваць.**

Скардзяцца на ваду, што яна «перашкаджае» працаваць, а калі вада спадзе і рэкі абмялеюць, яны напэўна скажуць: **«Як-жа сплаўляць, калі ў рэках вады няма».**

Прычыны, зразумела, не ў многаводзьдзі рэк, а ў самом кіраўніцтве сплавам, у арганізацыі сплаўных работ, у мабілізацыі мас на выкананьне сплаўной праграмы. Вось некаторыя лічбы, якія характарызуюць гэтую «мабілізацыю» мас.

На ўсіх вучастках Гомельскай канторы працуе 2.408 чал., а сацпаборніцтвам ахоплена толькі 52 чалавека. Ня лепш абстаіць справа з разгортваньнем сацпаборніцтва і ў Бабруйскай канторы. Там ахоп спаборніцтвам складае ўсяго 9 проц., занятых на сплаве рабочых.

Наогул трэба адзначыць, што сацыялістычныя мэтады работы на сплаве яшчэ не ўкаранены на належную вышыню ва ўсіх без выключэньня канторах. Ударнікі ёсьць усюды. Але ня ўсюды яны спаборнічаюць паміж сабою. Яны не баруць на сацыялістычны буксір адстаючых, ня ўжываюць гаспадарчага разрахунку ў брыгадах.

Адна з асноўных задач усебеларускага зьлёту ударнікаў сплаву—узьняць сацыялістычнае спаборніцтва на вышэйшую ступень, мабілізаваць ударнікаў на арганізацыю сацыялістычнага буксіру адстаючым, каб у бліжэйшыя дні выраўнець сплаўны фронт.

Ткач.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Помнік Леніну ў Барысаве

У дні сьвяткаваньня 16 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў г. БАРЫСАВЕ АДБУДЗЕЦЦА ЗАКЛАДКА ЖАЛЕЗАБЭТОННАГА ПОМНІКА УЛ. І. ЛЕНІНУ. Вышыня фігуры будзе роўна 5 мэтрам.

На помніку будуць зроблены барэльефы на тэмы «Ленін і нацыянальная палітыка», «Ленін і дыктатура пралета рыяту», «Ленін і грамадзянская вайна».

Праект заказан брыгадзе скульптараў БССР у складзе т. т. КЕРЗІНА, БЭМБЭЛЯ і АЗГУРА і скульптарам ГРУБЕ і БРАЗЭРА.

Праекты распрацоўваюцца ў парадку сацспаборніцтва і будуць прадстаўлены на абгаварэньне грамадзянасьці да 15-га верасьня.

Выраб піяніна ў БССР

Белкультпрамтрэст распрацоўвае праект пабудовы ў 1933-34 г. У БАРЫСАВЕ ФАБРЫКІ ДЭТАЛЯЙ КЛЯВІШНЫХ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМАНТАЎ (піяніна) з прадукцыйнасьцю да канца другой пяцігодкі ў 20 тыс. камплектаў у год. Фабрыка будзе мець усесаюзнае значэньне.

У Воршы праектуецца пабудова спэцыяльнай фабрыкі для зборкі піяніна. Для фабрыкі будзе прыстасован будынак былой электрастанцыі (Белта).

Усебеларуская масоўка ў Маскву і Ленінград

15 жніўня АПТЭ арганізуе УСЕБЕЛАРУСКУЮ МАСОЎКУ - ЭКСКУРСІЮ 200 ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ і герояў пяцігодкі па маршруту МЕНСК-МАСКВА-ЛЕНІНГРАД тэрмінам на 10 дзён.

Мэта масоўкі—азнаёміць ударнікаў БССР з гаспадарчымі і культурнымі дасягненьнямі двух буйнейшых пралетарскіх цэнтраў Саюзу.

Месцы для ўдзелу ў масоўцы разьмяркоўваюцца па прадпрыемствах БССР.

Фізкультурнікі да міжнароднага антываеннага дня

Віцебская арганізацыя фізкультурнікаў адзначае міжнародны антываенны дзень—1 жніўня правядзеньнем агляду сваёй работы. На прадпрыемствах па ініцыятыве фізкультурнікаў будуць праведзены палітмасоўкі з мэтай ахопу шырокіх мас рабочых здачай норм на значок «ГПА».

Фізкультурныя калектывы буйнейшых прадпрыемстваў Беларусі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск), Гомсельмашу, Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, магілёўскай шаўковай фабрыкі, менскага заводу імя Мясьнікова ўвязваюць гэту работу з спаборніцтвам на лепшую падрыхтоўку да сусьветнай рабочай спартакіяды 1934 году і на лепшую пастаноўку работы па здачы норм на значок ГПА.

(БЕЛТА).

Хроніка

* Тав. Бушуеў А. Д. назначан СНК БССР членам калегіі Наркамфіну і кіраўніком Белканторы сацзембанку.

* У Менску пушчана новая мэханізаваная пральня магчымасьцю ў 675 тыс. штук бялізны ў месяц. Пры пральні арганізавана мэханізаваная фарбарня.

* У раёнах брацкія могілкі—Лагойскі тракт, шадром—Юбілейны пляц і на Людаманце арганізуюцца тры новыя рынкі.

* Усебеларускі зьезд мопраўскай арганізацыі перанесьцца на лістапад.

* 20 студэнтаў-мопраўцаў менскіх інстытутаў па даручэньні ЦК Мопру выехалі ў раёны БССР для дапамогі мясцовым арганізацыям у рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі сярод аднасобшчыкаў.

* Адбыўся VII выпуск студэнтаў менскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага тэхнікуму. Выпушчана 165 чалавек. (Белта).

Паведамленьні

20 ліпеня г. г., а 12 гадз. дня аддзел кадраў Менгаркому КП(б)Б склікае нараду аб ходзе падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі ў сувязі з уборачнай кампаніяй па Менскім раёне.

На нараду выклікаюцца т. т. Плятнёў 1 Шэлет (1-ая МТС), Камэнштэйн і Каляда (2-ая Бальшавіцкая МТС), Жарын і Рогаўш (гарэа), Шчагін (ГК ЛКСМБ), загадчыкі сэктароў кадраў трэстаў: Садагародтрэст, Маслапрамтрэст, Сьвінаводтрэст, Птушкатрусаводтрэст, сакратары сельпартячэек: Ратам кі—Вэкер, Калодзішчы—Мацюхін, Крупіцкі — Шчарбовіч, прадстаўнікі газэт «Зьвязда» і «Рабочий».

Яўка ва ўказаны час абавязкова.

Менгарком КП(б)Б.

Менгарком КП(б)Б склікае на сёньня —20 ліпеня, а 7 гадз. увечары ў клюбе Камасьветы (пакой № 19, уваход з вул. Энгельса) пашыраную нараду па пытаньні праверкі рэалізацыі пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы камунальнай гарадзкой гаспадаркі.

Павінны прысутнічаць члены гарадзкой камісіі т. т. Гершон, Каранеўскі, Кавалёў, Капялевіч, Нэйштат, Даніловіч (гарКК), Шчагін (ГК ЛКСМБ), Карнейка і Мазо (жылкаапэрацыя).

Старшыні падкамісіі: на будаўніцтве —тав. Лазоўскі, па эксп. жылфонду тав. Даніловіч, па дабрабыту—тав. Гімэльштэйн, па кіраўніцтве кадраў — Рыс, камунальных прадпрыемствах — Герчыкаў (ГК КП(б)Б).

Таксама выклікаюцца пад адказнасьць старшынь падкамісій усе брыгадзіры брыгад, якія ўваходзяць у склад падкамісіі.

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Не чакайце апошніх дзён падпіскі

НА ГАЗЭТЫ:

„ЗЬВЯЗДА"
Орган ЦК і Мен. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

„ОРКА"
(на польскай мове)
Орган ЦК КП(б)Б

„РАЎДОНАСІС АРТОЯС"
(на літоўскай мове)
Орган ЦК КП(б)Б

НА ЧАСОПІСЫ

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"
Орган ЦК КП(б)Б

„БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК"
Часопіс культпропу ЦК КП(б)Б

„Работніца і Калгасьніца БССР"
Выданьне ЦК КП(б)Б

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО СВАЯЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЭТ І ЧАСОПІСЯЎ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Менгарбюро Саюздруку (Ленінская 31, 2-гі паверх) з 9 г. раніцы да 9 г. веч. тыражнымі работнікамі Саюздруку, лістаносцамі, якія маюць на гэта пасьведчаньне, а таксама ўсімі кіёскамі па продажы газэт.

ТОРГСІН
Беларуская кантора
даводзіць да ведама насельніцтва, што цэны на банкаўскае срэбра старой чаканкі і лом
ЗНАЧНА ПАВЫШАНЫ.
Срэбра прымаецца ўсімі скупачнымі пунктамі як спэцыяльнымі, так і пры універмагах.
За адзінае срэбра адпускаюцца тавары з любога магазыну і ў любом асартыменце.
Паступілі ў продаж новыя партыі тавараў па значна зьніжаных цэнах і вышэйшай якасьці.
— Белкантора ВІО ТОРГСІН.

ТАВАРЫСТВА ПРОЛЕТАРСКАГА ТУРЫЗМА І ЭКСКУРСІЙ ОПТЭ
БЮРО ПАДАРОЖЖАЎ ЦС ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
ЎСЕ БАЗЫ БЮРО ЎНОЎ АДРАМАНТАВАНЫ
і забясьпечаны харчаваньнем.
Члены ОПТЭ пры запісу атрымліваюць скідку ў разьмеры 10 проц.
ЗАПІСЬ НА МАРШРУТЫ Ў МЯСЦОВЫХ САВЕТАХ ОПТЭ.

ЧЫРВОНАЯ ЗЯРКА Каса—зд 1 г. дня — Вялікі мастацкі замежны фільм У ІМЯ КАХАНЬНЯ
МІТУРНА-ЦЫЯНАЛ — Замежная камэдыя КАЛІФ на ЧАС
Пралетары — ПАТ І ПАТАШОН у камэдыі „Ахоўнікі парадку"
СПАРТАК Каса—з 3 г. 30 м. — Выдатны фільм Дзяўчына са скрыпкай камэдыя ў 6 частках
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР — Лепшы мастацкі прыгодніцкі фільм УЛАДАР СЬВЕТУ ў 7 частках.

МАРЫНА-ГОРСКІ САДОВА-ГАРОДНЫ ТЭХНІКУМ,
які рыхтуе аграномаў сярэдняй кваліфікацыі, праводзіць набор студэнтаў на гародніцтва, пладова-ягаднае і тэхнічна - перапрацоўчае аддзяленьні. Прымаюцца асобы з ня дамі ў аб'ёме 7-годкі. Заявы з адпаведнымі дакумантамі прымаюцца да 10 жніўня. Іспыты з 15 да 25 жніўня. Пачатак заняткаў з 1 верасьня. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.
Адрас: Марына Горка, садоваагародны тэхнікум.
Дырэкцыя.

Да 15 жніўня праводзіцца набор студэнтаў у Менскі Беларускі пэдагагічны тэхнікум
(школьнае, дашкольнае аддзяленьні, аднагадовыя падкурсы і вячэрні тэхнікум).
Дакументы прыкладаюцца згодна дведніка НКА.
Іспыты ў аб'ёме сямігодкі па грамадазнаўстве, беларускай мове і матэматыцы з 20 па 29 жніўня.
55 проц. студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 40 да 60 р.
Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка, інтэрнат (для прыежджых) і прачачарня.
Заявы накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая 107—Белпэдтэхнікум.
Дырэкцыя.

ПАТРЭБЕН БУХГАЛЬТАР для прыгарадной гаспадаркі выдавецтва „ЗЬВЯЗДА".
Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх.

Бабруйскі лесатэхналёгічны тэхнікум
— абвяшчае —
чарговы набор студэнтаў
на першы курс 1933-34 навуч. году на аддзяленьні:
1) фанэрнае—60 асоб; 2) сталярна-будаўнічае і дэталей сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва—30 асоб на дзённы і 60 асоб на вячэрні.
У тэхнікум прымаюцца скончыўшыя сямігодкі, вучэрні школы павышанага тыпу і іншыя школы адпавядаючыя праграмам сямігодак, або скончыўшыя падрыхтоўчыя курсы ў тэхнікум з абавязковым трыманьнем іспытаў па: грамадазнаўству, беларускай мове і літаратуры, матэматыцы і фізыцы ў аб'ёме ведаў праграм сямігодкі.
Жадаючыя паступіць павінны падаць заяву на імя прыймовай камісіі на адрасе: г. Бабруйск, Савецкая 76, Лесатэхнікум—да 20 жніўня. З 20 па 28 жніўня праходзяць іспыты па вызначаных дысцыплінах. Заняткі пачнуцца з 1 верасьня.
Да заяў павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: 1) анкета, засьведчаная прафарганізацыяй, а для сялян—сельсаветам, 2) пасьведчаньне аб адукацыі (абавязкова арыгінал), 3) пасьведчаньне аб сацыяльным паходжаньні і праве гонару паступаючага і бацькоў, сац. становішча ў сучасны момант (сялянам даводкі ад сельсавету аб разьмерах сель-гаспадарчага на датку), 4) мэтрычную спраўку, 5) дведку аб адносінах па вайсковай павіннасьці, 6) дведку ад доктара аб стане здароўя, 7) дзьва фотакарткі, 8) паштовых марак на 40 кап.
Пры адсутнасьці яніх-небудзь дакументаў з вынясьні пералічанай прыймовай камісіяй заявы ня будзе разглядацца.
Прынятыя студэнты ў аднаведнасьці з пасьпяховасьцю, сац. становішчам і забясьпечванасьцю атрымліваюць дыферэнцыраваную стыпэндыю на 1-мм курсе да 50 руб., іншагародніх студэнты будуць забясьпечвацца інтэрнатам, а ўсе студэнты харчаваньнем у сталоўцы і пайком наўроўні з рабочымі трэсту фанэрнай прамысловасьці, якому тэхнікум падпарадкаван (1 спіс, 1 катэгорыя).
Правілы для паступаючых на вячэрні курс тэхнікуму тыя-ж, што і на дзённы за выключэньнем таго, што навучаньне на вячэрнім праходзіць без адрыву ад вытвор часьці.
Дырэктар тэхнікуму штыцко.

Адкрыт прыём заяў у Мсьціслаўскі пэдагагічны тэхнікум і на аднагадовыя падкурсы.
Прымаюцца з адукацыяй ня ніжэй сямігодкі. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заявы прымаюцца да 1-га верасьня. Да заявы прыкладаюцца дакументы, згодна існуючых правіл для паступленьня ў навучальныя установы.
Адрас: Мсьціслаў, пэдтэхнікум.
Дырэкцыя.

БАРЫСАЎСКІ РАСІЙСКІ ПЭДТЭХНІКУМ
абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ
НА І КУРС ТЭХНІКУМУ.
Прымаюцца асобы скончыўшыя сямігодку, згодна правіл прыёму ў тэхнікумы.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй на 75 проц.
Заявы і дакументы прымаюцца да 1-га верасьня г. г.
Дырэкцыя.

Барысаўская лесашкола
АБВЯШЧАЕ
асеньні НАБОР
НА АДДЗЯЛЕНЬНІ:
лесаэксплёатацыйнае —35 чал.
лесасплаўнае . . —35 чал.
мэханічнай перапрацоўкі драўніны і мэханічных установак . —70 чал.
У шкалу прымаюцца асобы, маючыя адукацыю за 5, 6 і 7 груп сямігодкі.
Тэрмін навучаньня два гады. Школа рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі па лесаэксплёатацыі, лесасплаву і па мэханічнай перапрацоўцы драўніны і мэханічных установках.
Да заявы патрэбна далучыць засьведчаную аднаго дведку аб сацыяльным становішчы, аб адукацыі, мэтрычны выпіс і аб стане здароўя.
Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Стыпэндыя на 1-м курсе ад 30 да 45 руб., на 2-м курсе ад 45 да 70 руб. у месяц у залежнасьці ад пасьпяховасьці.
Заявы прымаюцца да 20 жніўня, пачатак заняткаў з 1 верасьня.
Заявы з усімі дакумантамі накіроўваць па адрасу: гор. Барысаў, Андрэеўская, 22, Лесашколе.
Дырэктар Лесашколы М. ГУРМАН.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАЛІТЫКА-АСЬВЕТНЫ ІНСТЫТУТ
— абвяшчае —
АСЕНЬНІ ПРЫЁМ
на першы курс аргмасавага аддзяленьня.
Прыём заяў да 15 жніўня.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй. Раённ камандыруюць ня менш колькасьці, вызначанай разьвёрсткай. Правілы прыёму і разьвёрстка накіраваны культпропам РК КП(б)Б, РК ЛКСМБ раённай рэдпрафсакетам. Да заяў далучыць дакументы (у арыгіналах), пералічаныя ў правілах прыёму і накіраваць па адрасу: Магілёў Кансамольская 28, Палітасьветны інстытут.
ДЫРЭКЦЫЯ.

РЭЧЫЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ БЕЛПЭДТЭХНІКУМ
абвяшчае набор
на І курс і на аднагадовыя пэдкурсы.
Заявы з дакумантамі падаваць у кантору пэдтэхнікуму—гор. Рэчыца, вул. Луна чарскага, № 35, да 15-VIII-г. г.
Ясьвета—на ніжэй сямігодкі.
Студэнты і курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй на агульных падставах.
Ёсьць студэнцкая сталоўка.
Дырэкцыя.

ЧЭРЫКАЎСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
на першы курс тэхнікуму і на 9-цімесячныя вэтфэльчарскія курсы.
На першы курс прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку, а на вэтфэльчарскія курсы—з ведамі ў аб'ёме 5—6 год сямігодкі.
Студэнты і курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй, сталоўкай і інтэрнатам.
Прыём заяў з 20 чэрвеня па 15 жніўня.
Да заявы прыкладаюцца дакументы (у арыгіналах: аб сацстановішчы і паходжаньні, аб адукацыі, аб узросьце, аб здароўі і васьведчаная анкета.
Заявы з дакумантамі і 40 кап. маркамі накіроўваць па адрасу: гор. Чэрыкаў, вэтэхнікум.
Дырэкцыя.

Барысаўскі вячэрні лесрабфак
ПРЫ ГОМЕЛЬСКІМ ЛЕСАТЭХНІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
студэнтаў на 1, 2, 3 вячэрніх курсы рабфаку без адрыву ад вытворчасьці і 4-ы вячэрні курс з адрывам ад вытвор часьці.
Заявы з усімі неабходнымі дакумантамі згодна дведніка НКА накіроўваць па адрасу: гор. Барысаў, Андрэеўская 22, лесрабфаку.
Пачатак заняткаў 1-га верасьня.
Тэрмін прыёму заяў да 20-га жніўня г.г.
Дырэктар лесрабфаку М. Гурман.

ЗРК ф-кі „КАМУНАРКА" ПАТРЭБЕН
ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР
ЗВАРАЧАЦЦА:
3-я Лежа рта, праўленьне ЗРК

Беларускі сельска-гаспадарчы інстытут у г. Горках
АБЯЗ ШЧАЕ
АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ
НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ:
1. Зоатэхнічны (рыхтуе зоатэхнікаў па буйнай рагатай жывёле).
2. Агранамічны і глебазнаўства (рыхтуе спэцыялістаў на хімізацыі сельскай гаспадаркі).
3. Кормазабываньня і пасеінаводства (рыхтуе аграномаў па кормазабываньню і пасеінаводству).
4. Ільна і ідэнолі (рыхтуе аграномаў па ільнаводству і канаплявадству).
5. Эканомікі і плянавозьнаўства сельскай гаспадаркі (рыхтуе эканом. плянавікоў с.-г., арганізатараў выгаворчасьці, працы і тэх. нармаваньня).
6. Арганізацыі тэрыторыі (рыхтуе спэцыялістаў па землеўпарадкаваньню саўгасаў і калгасаў).
7. Рабочы факультэт.
Прыём заяў праводзіцца да 1 верасьня, 1933 г. Заявы падаваць на імя дырэктара сельска-гаспадарчага інстытуту гор. Горкі БССР.
Да заявы патрэбна прыкладаць наступныя дакументы:
1) анкету засьведчаную партыйнымі, прафэсіянальнымі або савецкімі арганізацыямі; 2) дведку аб узросьце; 3) аб сацыяльным і матэрыяльным становішчы, раённой для сялян-адзіначкоў—дведку аб с.-гасп. падатку); 4) аб выбарчых правах; 5) аб стане здароўя; 6) аб вайсковай павіннасьці; 7) аб адукацыі (арыгінал); 8) дзьве фотакарткі і 9) паштовых марак на 40 кап.
Усе прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатам (за выключэньнем самей студэнтаў і стыпэндыяй згодна палажэньня.
Адначасова з гэтым праводзіцца набор на завочны сэктар па вышэйпаказаных спэцыяльнасьцях.
Дырэктар Інстытуту БАРЫСЭВІЧ.

УСЕБЕЛАРУСКАМУ КАМІТЭТУ па РАДЫЁВЯШЧАНЬНЮ
ПАТРЭБНЫ на сталую работу кваліфікаваныя спэцёры, а таксама мастацка-літаратурныя і палітасьвет. дыкторы.
Прыём будзе праводзіцца ў парадку конкурсу.
Жадаючыя трымаць іспыты павінны зьвяртацца па адрасу: Менск, Універсітэцкая, № 15.

Выдавецтву „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБНЫ
ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР і БУХГАЛЬТАР
Зварачацца: Савецкая 63, 2-гі паверх.

ПАТРЭБЕН пам. БУХГАЛЬТАРА.
І ВОПЫТНЫ РАХУНКАВОД.
Зварачацца да заг. сталоўкі друк. „ЗЬВЯЗДА", Савецкая 63.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культур нага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага будаўніцтва і снабжэньня наапэрацыі і мае ка